

АБ'ЯДНАНЫЯ БЕГАМ

8

СКАРБЫ МУЗЕЯ КНІГІ

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ВЕРАСНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 176 (29545)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Мы сёння маем стабільны рынак працы. Узровень беспрацоўя ў шэрагу еўрапейскіх краін дастаткова высокі, у нас жа па выніках 2020 года, а таксама гэтага года — менш за 4 %. У студзені 2020 года былі зацверджаны змены ў Працоўны кодэкс. Мы прынялі новыя, гнуткія формы занятасці — дыстанцыйная работа, што дазволіла нашаму рынку працы спакойна перажыць 2020-ы год. І сёння, бачачы сур'ёзныя пасылы і патрэбы рынку працы да гэтых дыстанцыйных форм занятасці, мы ідзём далей і падрыхтавалі новыя змены ў ПК у частцы камбінаванай дыстанцыйнай работы. Гэта запыт з боку работадаўцаў. Ужо прайшла сур'ёзная дыскусія з органамі дзяржаўнага кіравання, наймальнікамі, падрыхтаваны праект знаходзіцца на фінальнай стадыі перад прадстаўленнем яго ўраду. А ў наступным годзе ён будзе разгледжаны дэпутатамі ў двух чытаннях».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Вайны не будзе толькі тады, калі мы будзем вось так вучыцца і паказваць свайму праціўніку, што ўмеем»

**У населеным пункце «Зорнае», што паміж Баранавічамі і Слонімам, уведзена ваеннае становішча. У небе праносяцца сапраўдныя знішчальнікі, кружацца верталётныя групы, у бой выступаюць танкі, у далечыні разрываюцца снарады і стаяць слупы дыму. Але вёска «Зорнае» размешчана на палігоне «Абуз-Лясноўскі», ды і змяшчае толькі бутафорскія збудаванні. Гэты сцэнарый аднаго з асноўных розыгрышаў практычных дзеянняў войскаў падчас сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2021» вайскоўцы падрыхтавалі для кіраўніка краіны, ваенных начальнікаў, журналістаў і... апанентаў, супрацьлеглага ваеннага блока, прадстаўнікі якога не пажадалі на ўласныя вочы назіраць за вучэннямі, але, напэўна ж, уважліва сачылі за імі з дапамогай касмічных рэсурсаў.**

**Прынамсі, такую думку выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які ў нядзелю наведаў палігон «Абуз-Лясноўскі», дзе праходзіла актыўная фаза вучэнняў «Захад-2021».**

**Падчас візіту кіраўніку краіны далажылі аб сумесных дзеяннях падраздзяленняў рэгіянальнай групоўкі сіл, паказалі дасягнуты ўзровень узаемадзеяння пры выкананні задач. Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў ваеннаслужачых, што вылучыліся на вучэннях. Таксама Прэзідэнту паказалі новыя і мадэрнізаваныя прыклады ўзбраення і тэхнікі.**



Фота БелТА.

### На фоне гібрыднай вайны

У сваім выступленні пасля назірання за ходам актыўнай фазы вучэння Прэзідэнт адзначыў, што яно праводзіцца на фоне беспрапыннай гібрыднай агрэсіі з боку Захаду.

«Мы бачым новыя рызыкі і выклікі на захадзе Саюзнай дзяржавы, абвастрэнне становішча на межах дзяржаў — членаў АДКБ. Створаная вучэбная абстаноўка дазваляе ўдасканальваць навыкі ў вядзенні сумесных баявых дзеянняў пры адбіванні агрэсіі», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да ваеннаслужачых.

Ён адзначыў, што ўдзел у вучэннях разам з беларускімі і расійскімі вайскоўцамі прымаюць прадстаўнікі Узброеных Сіл Казахстана, а таксама тэрытарыяльныя войскі Беларусі, якія з поспехам выканалі ўсе пастаўленыя задачы.

СТАР. 2

Ракурс

# УТРЫМАЦЦА НА ПЛАВУ

## Як дзяржава дапамагала бізнесу выжыць

**У СААЗ заяўляюць, што да завяршэння пандэміі COVID-19 яшчэ вельмі далёка, што многае сёлета будзе залежаць ад паспяховага і хуткага правядзення кампаніі вакцынацыі супраць каранавіруса. Аднак эканоміка ўсё ж уступіла ў перыяд павольнага аднаўлення. У сувязі з тым, што ў ёй, сусветнай, сектар малога і сярэдняга прадпрымальніцтва (МСП) з'яўляецца асноўным генератарам працоўных месцаў, а таксама крыніцай росту, уклад якога дасягае каля 50 % сусветнага ВУП, вельмі важнымі становяцца захады дзяржавы, якія прымаліся для падтрымкі МСП. Разбіраемся з прадстаўнікамі бізнес-супольнасці і Міністэрствам эканомікі краіны, наколькі эфектыўнымі яны аказаліся.**

СТАР. 7



Дзень, які варта адзначаць

# ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ




**Час няўмольны. Павольна сціхае боль, хаваецца за паўсядзённасцю радасць. Застаюцца знакі, назвы, імёны і пераказы пра перажытае. Гэта датычыцца як асабістай памяці кожнага з нас, так і памяці агульнай, народнай, гістарычнай. Першая жыве, пакуль жывём мы, другая — пакуль жыве пакаленне. Каб захаваць надалей, яе трэба перадаць — калі гэта важна. Так мы расказваем дзецям пра радасныя і сумныя, трагічныя падзеі ў нашым жыцці. І пакідаем помнікі — у камені, слове, геаграфічных назвах — пра падзеі ў жыцці народа, краіны. Гэта публікацыя — пра некаторыя такія знакі-напаміны. Пра тое, што пакінулі для нас нашы папярэднікі. А мы згадваем і перадаём далей — нашчадкам.**

СТАР. 11

## КОРАТКА

- **У Беларусі ў электронную форму пераведзена 61 адміністрацыйная працэдура.**
- Наймальнікі Мінска 16 верасня на электронным кірмашы вакансій прапануюць больш як 500 працоўных месцаў.
- **У Дзень горада ў Мінску нарадзіліся 20 хлопчыкаў і 21 дзяўчынка.**

ISSN 1990 — 763X

21176>

# «Вайны не будзе толькі тады, калі мы будзем вось так вучыцца і паказваць свайму праціўніку, што ўмеем»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт асобна звярнуўся да тэрытарыяльных войскаў і адзначыў, што чарговы раз пераканаўся ў дзеяздольнасці створанай сістэмы тэрытарыяльнай абароны: «Яшчэ ўчора вы мірна працавалі на заводах і фабрыках, убіралі ўраджай і аралі зямлю, а сёння са зброяй у руках адбілі атаку праціўніка. Сумесна з асабістым складам рэгіянальнай групоўкі войскаў і нашымі саюзнікамі па АДКБ вы з гонарам выканалі вучэбна-баявыя задачы».

Паводле яго слоў, нікому не трэба сумнявацца, што беларусы, расіяне, казахстанцы і грамадзяне астатніх дзяржаў — членаў АДКБ гатовыя зрабіць усё для захавання рэгіянальнай бяспекі, міру ў сваёй Бацькаўшчыне.

Прэзідэнт падзякаваў прызваным на вучэнні грамадзянскім асобам за адказнасць. «Часта кажам: нічога страшнага, усё будзе добра, ніякай вайны не будзе. Вайны не будзе толькі тады, калі мы будзем вось так вучыцца і, галоўнае, паказваць свайму праціўніку, што мы ўмеем», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён паставіў задачу губернатарам: знайсці магчымасць матэрыяльна падзякаваць хлопцам, якіх прызвалі для ўдзелу ў вучэннях. Гэта датычыцца і іншых вайскоўцаў-удзельнікаў «Захад-2021».

«Я прашу Міністэрства абароны, мясцовыя органы ўлады, урад Беларусі знайсці магчымасць падтрымаць сяброў з Расіі і Казахстана, што прыбылі да нас, на ўдзячную беларускую зямлю, каб яны разумелі: гэта іх зямля і што мы абавязкова будзем абараняць гэтую зямлю, як тое рабілі нашы продкі ў свяшчэннай Брэсцкай крэпасці», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

### Асноўны партнёр — Расія

Пасля назірання за вучэннямі Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з журналістамі беларускіх і замежных СМІ.

«Мы вядзём перагаворы і плануем пастаўкі С-400 (з Расіі. — **«Зв.»**). Калі закончыць гэтую тэму, то мы на сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі ўдзялілі пытанням абароннай бяспекі вельмі шмат увагі. І гэтае пытанне было ўплецена ва ўсе пытанні», — расказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, падчас перагавораў у Крамлі надалі шмат часу праблематыцы бяспекі і абароне. «Ён (Прэзідэнт Пуцін. — **«Зв.»**) мне расказаў пра больш сучасны комплекс С-500, які можа працаваць па балістычных ракетах. Вельмі эфектыўны комплекс. Ён прайшоў выпрабаванні і рыхтуецца да прыёму на ўзбраенне. Я яму яшчэ раз нагадаў пра С-400, расказаў, дзе мы хочам паставіць гэтыя комплексы», — дадаў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка сцвярджае, што комплексы С-300 у Беларусі ахоўваюць перыметр з захаду, але неабходна зараз паклапаціцца пра ахову краіны на паўднёвым напрамку.

«Мы з генераламі абмяркоўвалі гэтую тэму. Нас пачынаюць «падаграваць» з поўдня. Мы павінны рыхтавацца. 200 кіламетраў — граніца з Украінай. Нам прыйдзецца закрываць гэты перыметр. Вялі размову, што С-400 там будзе да месца», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што на куплю комплексаў пойдзе прыкладна адзін мільярд долараў. Таксама кіраўнік краіны падзякаваў старшыням ваенных ведамстваў Расіі за ўзгадненне пераліку ўзбраення, якое да 2025 года будзе пастаўлена ў Беларусь. «Гэта каля дзясятка самалётаў, што вы бачылі. Частка іх да нас паступіла. Гэта некалькі дзясяткаў верталётаў, Тор-М2. Гэта сведчыць, што мы і Расійская Федэрацыя вельмі сур'ёзна ўспрымаем заходні напрамак, дзе знаходзімся ў судакрананні з заходнімі войскамі. Нельга расслабляцца, — мяркуе Аляксандр Лукашэнка. — Мы хочам быць загадзя гатовыя, і сутнасць гэтага — сучасныя вучэнні». Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў: нашы ракеты не нацэлены на сумежныя дзяржавы, мы толькі рыхтуемся абараняць свае землі.

### «Зацягнула канкрэтыка»

Прэзідэнт расказаў, калі плануюць адкрыць беларуска-расійскую граніцу для аўтамабільных перавозак.

«Я думаю, у гэтым годзе, як толькі пад'ём захваральнасці (на ковід. — **«Зв.»**) спыніцца. Вы ж бачыце, у свеце ідзе пад'ём захваральнасці, асабліва ў нас, у паўночных краінах. Мы не хвалюемся на гэты конт. Неабходна разабрацца, за кошт чаго пад'ём, бо і грыпуюць людзі. Восень — ранняя зіма — перыяд, калі ўсе вірусы збіраюцца разам. Як толькі ўбачым зніжэнне, мы з Прэзідэнтам Расіі не адзін раз сустрэнемся і будзем мець на ўвазе гэта пытанне», — сказаў беларускі лідар.

Ён расказаў журналістам, што абмяркоўваў з Уладзімірам Пуціным за зачыненымі дзвярыма пасля прэс-канферэнцыі. «Мы па прапанове Уладзіміра Уладзіміравіча вярнуліся ў кабінет, чаю папілі, і зацягнула нас канкрэтыка: будаўніцтва аб'ектаў, у тым ліку касмадрома «Усходні». Ён прапаноўваў даўно нам падцягнуцца да гэтага пытання. На стадыі заканчэння будзем там будаваць. Пасля Варонежа, будаўніцтва школы, на 100 мільёнаў долараў папрасілі нас яшчэ пабудаваць сацыяльныя аб'екты. Вось у розных пунктах — ад будаўніцтва і заканчваючы ўзбраеннем — мы да дзвюх гадзін ночы абмяркоўвалі гэтыя пытанні», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, перад пасяджэннем Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы Уладзімір Пуцін прыляціць у Мінск у сярэдзіне кастрычніка на саміт кіраўнікоў краін СНД, і там працягнецца абмеркаванне разнастайных двухбаковых пытанняў.

### Пра нелегальных мігрантаў

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, чамусьці асабліва мусіруецца паток бежанцаў у Еўропу праз Беларусь, але нелегальныя мігранты едуць на захад і праз іншыя краіны: «Да нас прылятаюць паветраным шляхам. Яны не ідуць пешшу праз Расію. Літаральна некалькі чалавек да нас пранiклі праз Расійскую Федэрацыю. Гэта абсалютна мірныя афганцы. Але іх туды (у Еўропу. — **«Зв.»**) не пускаюць, а цкуюць сабакамі, прымяняюць электрашокеры, страляюць, пужаючы гэтых людзей».

Прэзідэнт мяркуе, што бежанцы — не праблема Беларусі. Але пакуль з Беларусі не будуць знятыя санкцыі, ніхто з еўрапейскімі палітыкамі не збіраецца абмяркоўваць пераадоленне міграцыйнага крызісу. Захад раней заявіў, што гатовы прыняць усіх бежанцаў з Афганістана і іншых краін, але зараз выганяе іх са сваіх тэрыторый.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што дапамогі еўрапейцам з бежанцамі, як раней, не будзе. «Мы іх затрымлівалі, у нас тут цэлыя анклавы ствараліся бежанцаў. Іх адпраўлялі да расіян. Тыя іх вярталі дамоў. А зараз — няхай забіраюць і самі з імі разбіраюцца. Хочаце дапамогі — вядзіце сябе годна. Не трэба нас лічыць людзьмі другога гатунку», — сказаў Прэзідэнт еўрапейскім партнёрам.

Ён перадаў журналістам сутнасць размовы Уладзіміра Пуціна са старшынёй Еўрапейскага савета Шарлем Мішэлем. Па яго словах, еўрапейскі палітык прасіў Пуціна «націснуць» на Беларусь па праблеме нелегальных мігрантаў. «Пуцін кажа: «Як я націсну? Гэта ж самастойная дзяржава. Чаму вы не хочаце з ім сам перагаварыць? Вы з талібамі размаўляеце — гэта міжнародная тэрарыстычная арганізацыя, прызнаная такой ААН». Яму адказваюць: «Талібы кантралююць тэрыторыю». Пуцін пытаецца: «А што, Лукашэнка Беларусь не кантралюе?» На гэта яму адказалі маўчаннем», — расказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка працягнуў, што акрамя палітычных пытанняў еўрапейцы праяўляюць варожыя заходы і ў сферы спорту, культуры. Як прыклад, прывёў дыскваліфікацыю з Міжнароднай федэрацыі хакея на лёдзе былога кіраўніка Федэрацыі хакея Беларусі Дзмітрыя Баскава. «Гэта значыць, яны заходзяць, прабачце мне, як сабакі пабітыя, прытым у дробязях: па спорце, культуры, па ўсіх кірунках. Пачынаюць нашых хлопцаў ціснуць ні за што: выйшаў Баскаў са сцягам за Прэзідэнта — вораг, мы патрабуем выключыць цябе з федэрацыі. Мярзотнікі дробязныя. Гэта сапраўды несамавітыя паводзіны», — заявіў Прэзідэнт.

Ён паведаміў, што па ініцыятыве еўрапейскіх палітыкаў, асабліва польскіх, Беларусь вядзе з імі дыялог. Асноўныя патрабаванні суразмоўцаў датычацца ўнутранай палітыкі Беларусі.

«Палітвязні, выбары і іншае. Слухайце, вы займіцеся ў сябе там. Сённяшні прэзідэнт Польшчы перамог на выбарах толькі на некалькі тысяч галасоў. Нават працэнта больш не набраў за канкурэнта. Памятаеце, як ускалыхнуліся там пратэсты. Амерыканцы хутка пасадзілі Польшчу на месца, бо яны на павадку кароткім, кручку фінансавым», — кажа кіраўнік Беларусі.

### Не прысутнічалі, але ўсё бачылі

Прэзідэнт заявіў, што прадстаўнікі заходніх ваенных структур былі запрошаны да назірання за вучэннямі, але адмовіліся прысутнічаць.

«Іх тут не было, але яны ўсё бачылі. Такія маштабныя вучэнні толькі вар'яты могуць не бачыць. Амерыканцы ўсё бачылі. Калі спецыяльна не прыехалі, гэта бяздумная пазіцыя. Ваенныя разумеюць, што яны разглядаюць з космасу кожны квадратны метр. Яны ведаюць задумы — мы не хаваем. Мы кажам пра колькасць, пра расійскія войскі, што запрашаем да нас», — падкрэслівае кіраўнік краіны.

Прэзідэнт дадаў, што беларусы разам з расійскімі спецслужбамі адсочваюць шпіёнаў, што пранікалі ў Беларусь з тэрыторыі Украіны, Расіі. «Кагосьці павязалі, кагосьці выкінулі адсюль. Даўно цікавяцца і задумамі, і тэхнікай, якая будзе», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА,**
*Баранавіцкі раён.*

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА 15 ВЕРАСНЯ ПАЛЯЦІЦЬ У ТАДЖЫКІСТАН

У Душанбэ Прэзідэнт Беларусі з рабочым візітам будзе знаходзіцца да 17 верасня. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе кіраўніка краіны. Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ і пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

Акрамя таго, па прапанове Прэзідэнта Беларусі запланавана сустрэча кіраўнікоў дзяржаў ШАС і АДКБ, на якой абмяркуюць сітуацыю ў Афганістане і меры па забеспячэнні бяспекі ў рэгіёне.

Захад-2021

# ВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ ДЭСАНТНІКАЎ

Пачаўся другі этап сумеснага беларуска-расійскага стратэгічнага вучэння

**Першыя задачы ўдзельнікі манеўраў пачалі адпрацоўваць яшчэ да ўзыходу сонца. Вайскоўцы з Беларусі, Расіі і Казахстана ажыццявілі дэсантаванне з самалётаў Іл-76 на палігоне «Брэсцкі».**

Гэты асноўны элемент баявой падрыхтоўкі дэсантнікаў могуць выканаць толькі сапраўдныя прафесіяналы: ускладняюць задачу з парашутам зброя і абмундзіраванне, грузы шматлікага прызначэння. Здзейсніць скачок у начных умовах — гэта як лётчыку ажыццявіць фігуру вышэйшага пілатажу.

— Асаблівасць дэсантавання ноччу — абмежаваная бачнасць, — заўважыў **намеснік камандзіра 38-й Брэсцкай асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады па паветрана-дэсантнай падрыхтоўцы гвардыі палкоўнік Уладзімір ГНЕДЧЫК.** — Перыметр пляцоўкі прызямлення абазначаўся агнямі, акрамя таго, быў пазначаны цэнтр пляцоўкі і страла, якая ўказвае напрамак ветру. Аблегчылі задачу вайскоўцам акуляры начнога бачання.

Першымі з вышыні 1,5 кіламетра дэсантаваліся расійскія групы спецыяльнага прызначэння. Калі ваеннаслужачыя Узброеных Сіл Расіі «захапілі» пляцоўку для высадкі асноўнага дэсанта, паспяхова прызямліліся беларускія і казахстанскія вайскоўцы. Затым саюзны дэсант прыступіў да выканання вучэбна-баявых задач, пастаўленых на гэтым этапе вучэння.

Як зазначыў **намеснік камандзіра 35-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады па паветрана-дэсантнай падрыхтоўцы гвардыі падпалкоўнік Абдурахім ЮЛДАШАЎ,** ваеннаслужачыя казахстанцы ўпершыню прымаюць удзел у такім маштабным вучэнні сумесна з вайскоўцамі Беларусі і Расіі. «Мы атрымліваем каласальны вопыт: Іл-76 не знаходзіцца ў нас на ўзбраенні, і нашы дэсантнікі выконвалі скачок з гэтага самалёта ўпершыню», — падкрэсліў прадстаўнік Узброеных Сіл Рэспублікі Казахстан.

**Вераніка КАНЮТА.**



Фота «Ваяр».

А тым часам на палігоне «Сары-Шаган», што ў Казахстане, беларускія ракетчыкі паспяхова ажыццявілі пускі з ракетных сістэм залпавага агню «Смерч» і «Паланэз».

Як адзначыў **начальнік ракетных войскаў і артылерыі Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Генадзь КАЗЛОЎСКІ,** усе задачы выкананы з высокай якасцю, а галоўнае — з найвышэйшай адказнасцю. «Беларускія ракетчыкі чарговы раз пацвердзілі свой прафесіяналізм, а таксама характарыстыкі даручанай высокадакладнай зброі, — заявіў военачальнік. — Спецыялісты войскаў сувязі і радыёэлектроннай барацьбы, ракетна-артылерыйскага ўзбраення, навігацыйна-тапаграфічнай службы, а таксама разлікі беспілотных авіяцыйных комплексаў забяспечылі выкананне задач ракетнымі падраздзяленнямі своечасова і з высокай дакладнасцю».

Ракетчыкі працягваюць адпрацоўваць навыкі і зладжанасць пры нанясенні ракетных удараў, аднак ужо без баявых пускаў.

У цэнтры ўвагі

# «Мы гатовы да дыялогу, але не да прымусу»

**Дэпутаты ўсіх узроўняў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу прынялі зварот да міжнароднай супольнасці ў сувязі з сітуацыяй вакол Беларусі.**


Фота БелТА.

«Мы, дэпутаты і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, паўнамоцныя прадстаўнікі беларускага народа, звяртаемся да сусветнай супольнасці з заклікам непрадузята ацаніць сітуацыю, якая складваецца вакол нашай краіны, калі пад выглядам барацьбы за дэмакратычныя каштоўнасці, па сутнасці, маюць месца агрэсіўны ўсебаковы ціск на суверэнную дзяржаву і яе грамадзян, грубае парушэнне базавых прынцыпаў міжнароднага права па неўмяшанні ва ўнутраныя справы дзяржаў. Такія дзеянні ствараюць рэальную пагрозу міжнароднаму міру і бяспецы, парушаюць агульнапрызнаныя палажэнні Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, адной з заснавальніц якой была і наша краіна», — гаворыцца ў звароце.

Незалежнасць, развіццё чалавечага патэнцыялу, эканамічны рост і ўмацаванне Беларусі з'яўляюцца як відавочнай асновай дабрабыту жыхароў нашай краіны, так і залогам геапалітычнай стабільнасці ў велізарным рэгіёне, які злучае Еўропу, Расію і Азію.

Аўтары звароту лічаць, што замест падтрымкі і развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва цэлы шэраг дзяржаў актыўна спрые дэстабілізацыі становішча ў Рэспубліцы Беларусь — супраць нас разгорнута масіраваная інфармацыйная агрэсія, накіраваная як на ўцягванне нашых грамадзян у дэструктыўную дзейнасць з мэтай здзяйснення дзяржаўнага перавароту, так і на фарміраванне вельмі негатыўнага вобраза краіны на міжнароднай арэне.

«Уводзяцца беспрэцэдэнтныя і неабгрунтаваныя санкцыі. Абсурднымі выглядаюць дзеянні па пазбаўленні Рэспублікі Беларусь правоў на правядзенне міжнародных спартыўных спаборніцтваў, удзел у творчых і прафесійных конкурсах, забарона на ажыццяўленне авіязносін, дыскрымінацыя кампаній і арганізацый, а ў канчатковым выніку — звычайных грамадзян нашай краіны. Беларусы вытрымаюць гэтыя выпрабаванні, таму што нам ёсць што губляць. У XX стагоддзі мы двойчы аднаўлялі сваю краіну — з руін Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў і рэшткаў разбуранага ў 1991 годзе СССР. Таму не толькі моцная дзяржаўная ўлада і моцныя органы правапарадку не дазволілі ператварыць Беларусь у чарговую гарачую кропку на палітычнай карце свету, але і кожны беларус адчувае датычнасць да стварэння краіны, разумее сваю адказнасць за яе будучыню», — акцэнтуецца ўвага ў дакуменце.

Дэпутаты і сенатары падкрэсліваюць: сёння палітычны і эканамічны ціск на нашу краіну не спыняецца, а толькі ўзмацняецца. Заяўленая мэта — садзейнічанне ўмацаванню дэмакратычных каштоўнасцяў і свабод. Аднак фактычны вынік цалкам іншы — падрыў эканамічнага патэнцыялу нашай краіны, запаволенне развіцця, скарачэнне сацыяльных праграм, зніжэнне дабрабыту людзей і, як вынік, злом суверэннай беларускай дзяржаўнасці, фарміраванне зоны эканамічнай, геапалітычнай, сацыяльнай нестабільнасці ў самым цэнтры Еўропы, якая і так перажывае цэлы шэраг крызісаў — міграцыйны, эканамічны, пандэмію COVID-19.

«Мы звяртаемся да нашых замежных партнёраў з заклікам — выконвайце прынцыпы і нормы міжнароднага права ва ўзаемаадносінах з Беларуссю, бо, разбурыўшы іх аднойчы, зноў надаць ім значнасць будзе складана. Мы гатовыя да дыялогу, але не да прымусу, і адказна заяўляем аб бесперспектыўнасці і недальнабачнасці любых замахаў на наша права самастойна выбудоўваць шлях развіцця Рэспублікі Беларусь», — гаворыцца ў звароце.

Напрыканцы яго аўтары заклікаюць сусветную супольнасць выступіць супраць неабгрунтаванай, контрпрадуктыўнай і дыскрымінацыйнай палітыкі ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь, праявіць салідарнасць з нашай краінай у адстойванні права на суверэнітэт і мірнае жыццё, вярнуцца да адказнага і канструктыўнага ўзаемадзеяння на карысць усіх краін і народаў, у імя міру, бяспекі і росквіту.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

Акцэнты

# ПАРАДАК ДНЯ — САЮЗНЫ

**У Савеце Рэспублікі ў панядзелак, 13 верасня, прайшла сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Дзмітрыем МЕЗЕНЦАВЫМ.**

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, бакі абмеркавалі вынікі перагавораў кіраўнікоў дзяржаў, якія прайшлі на мінулым тыдні, узгадненне імі 28 саюзных праграм інтэграцыі ў Саюзнай дзяржаве, пытанні правядзенага пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы.

На сустрэчы таксама была падкрэслена асаблівая значнасць міжпарламенцкага супрацоўніцтва, узаемадзеяння ў рамках Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, а таксама маладзёжных парламенцкіх структур.

Акрамя таго, бакі зрабілі акцэнт на неабходнасці ўмацавання міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння. Асаблівая ўвага ў гэтым кантэксце ўдзелена рэалізацыі рэкамендацый і прапаноў, замацаваных у выніковым дакуменце VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

Слова дэпутата

# Паказчык сталасці грамадства

**Валянціна БЕГЕБА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы:**



— Свята, якое мы будзем адзначаць на гэтым тыдні, сімвалізуе глыбокія гістарычныя традыцыі нашага народа. Адна з іх — традыцыя яднання для дасягнення агульных мэт. Спрадвеку ў нашым краі ўсё важнае рабілі талакой, гэта значыць, разам, агульнымі намаганнямі. Вось і зараз мы павінны аб'яднацца, каб забяспечыць мір і спакой у краіне як залог магчымасці для стваральнай працы.

Менавіта адказнасць за лёс Айчыны пабуджае кожнага з нас пераадольваць выклікі сучаснасці, захоўваць культурную самабытнасць, рухацца далей з апорай на традыцыі і напрацоўкі папярэднікаў. Думаю, што кожны з нас адчувае адказнасць за сучаснае і будучае Беларусі. І гэтая адказнасць найперш увасабляецца ў паўсядзённай працы, а таксама актыўнай грамадскай пазіцыі.

Праца як і раней, так і цяпер — галоўнае, з працы пачынаецца дабрабыт кожнага грамадзяніна і краіны ў цэлым. Калі кожны будзе творча, самааддана працаваць на сваім рабочым месцы, мы многага зможам дасягнуць. Важна знаходзіць рэзервы ў сабе, не спыняцца на дасягнутым, увесь час займацца самаадукацыяй і павышэннем свайго ўзроўню. Кожны раз гэта падкрэсліваю, калі даводзіцца быць у маладой аўдыторыі.

Найперш у моладзі нам трэба выхаваць павагу да чалавека працы і працы як адзінай крыніцы дабрабыту і творчай самарэалізацыі. Павага да працы ў шырокім сэнсе, павага да мацярынства, шанаванне старэйшых, сваёй гісторыі, малой радзімы — гэта і ёсць падмуркі, на якіх можна будаваць народнае адзінства.

Прапаную ўспомніць не такую далёкую гісторыю, пасляваенны час, час юнацтва нашых бацькоў. Калі краіна фактычна ляжала ў руінах, яны здолелі яе ўзняць, адрадзіць, пабудаваць эканоміку менавіта таму, што праявілі адзінства. Такіх прыкладаў у нашай гісторыі многа.

Народнае адзінства — гэта неад'емны аспект сучаснага грамадства, а яшчэ залог стабільнага і паспяховага развіцця на доўгія гады наперад, найважнейшы паказчык сталасці грамадства.

**Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Таццяне Яўгенаўне Абаевай, вядучаму бухгалтару галоўнага фінансавага ўпраўлення Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Алене Анатолеўне Ліхачовай, намесніку начальніка ўпраўлення па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Англіі вырашылі не ўводзіць пашпарты вакцынацыі




«Мы не павінны ўводзіць пашпарты вакцынацыі дзеля саміх пашпартоў. Я рады паведаміць, што гэтыя планы адмяняюцца», — заявіў міністр аховы здароўя Вялікабрытаніі Саджыд Джавід, паведаміла «Бі-бі-сі». План увядзення пашпартоў вакцынацыі павінен быў уступіць у сілу ў Англіі, дзе пражывае звыш 80 працэнтаў насельніцтва Злучанага Каралеўства, напрыканцы месяца. Меркавалася, што пры наведванні клубаў або масавых мерапрыемстваў неабходна будзе прад'явіць пацвярджэнне вакцынацыі ад COVID-19, адмоўны тэст на каранавірус або пацвярджэнне завяршэння тэрміну самаізаляцыі пасля станоўчага ПЛР-тэста. Ва ўрадзе падкрэсліваюць, што магчымасць увядзення такіх пашпартоў застанецца ў якасці запаснога варыянта ўлад. Разам з тым у Шатландыі пашпарты вакцынацыі ўвядуць з 1 кастрычніка.

### У КНДР правялі выпрабаванні ракет вялікай далёкасці новага тыпу



Аб гэтым паведаміла агенцтва «Рэнхап». Па сцвярджэнні Пхеньяна, выпрабаванні адбыліся на выхадных. Работа над новым тыпам ракет заняла два гады. Паўночнакарэйскае агенцтва ЦТАК называе крылатыя ракеты вялікай далёкасці «стратэгічнай зброяй, якая мае вельмі важнае значэнне». «Паспяхова праведзены дбайныя выпрабаванні кампанентаў ракеты, мноства тэстаў рухавіка, розныя лётныя выпрабаванні, тэсты сістэм кантролю і кіравання, тэсты магутнасці боегалоўкі, а таксама іншыя выпрабаванні», — перадала ЦТАК. У паведамленнях СМІ не раскрываюцца меркаваныя характарыстыкі ракет.

### Астраномы выявілі ў Сонечнай сістэме больш за 460 невядомых аб'ектаў



Міжнародная група астраномаў на аснове даных Агляду цёмнай энергіі (Dark Energy Survey) склала новы каталог аб'ектаў нашай Сонечнай сістэмы. У яго ўвайшлі 815 ідэнтыфікаваных транснептунавых аб'ектаў (TNO), паведаміла Science Alert. 461 аб'ект раней не быў вядомы. Новы каталог ужо падрыхтаваны для публікацыі. У сваёй працы навукоўцы ў галіне космасу з усяго свету засяродзіліся на вывучэнні знешніх слаёў нашай Сонечнай сістэмы. Напрыклад, за арбітай Нептуна, адной з самых цёмных і аддаленых абласцей Галактыкі, пры дапамозе новага даследавання атрымалася разгледзець наяўнасць раней невядомых касмічных целаў. Агляд быў складзены на аснове назіранняў, якія былі атрыманы ў перыяд са жніўня 2013 года да студзеня 2019-га. Галоўнай задачай праекта з'яўлялася выяўленне TNO, а таксама вывучэнне звышновых і скапленне галактык. У далейшым навуковыя даныя плануецца выкарыстоўваць пры разліку хуткасці пашырэння Сусвету, на якую, па меркаванні навукоўцаў, уплывае цёмная энергія.

Жніво-2021

# СВАЮ МІСІЮ АГРАРЫІ ВЫКАНАЛІ

## На поўначы краіны падвялі вынікі ўборкі

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ у нядзелю правёў прэс-канферэнцыю, прысвечаную развіццю аграпрамысловага комплексу і правядзенню абласных «Дажынак».**



Свята адбудзецца ў найбліжэйшыя выхадныя дні ў Шуміліне, да якога ад Віцебска каля сарака кіламетраў. Кіраўнік рэгіёна расказаў, што там капітальна адрамантавалі, мадэрнізавалі, добраўпарадкавалі, прывялі ў парадак каля ста аб'ектаў. І такая работа вядзецца ў іншых райцэнтрах. Падчас падрыхтоўкі да «Дажынак» рамонты вядуцца ў школах, садках, на стадыёнах, у фізкультурна-аздараўленчых цэнтрах, медыцынскіх установах і іншых сацыяльных аб'ектах. Не забываюць рамантаваць і жыллё, добраўпарадкоўваць вуліцы і двары.

У наступным годзе сталіцай аграрнага свята стане Глыбокае, а ў 2023-м — Шаркаўшчына.

На вялікі жаль, з-за неверагоднай спякоты (20 чэрвеня быў пабіты рэкорд максімальнай тэмпературы паветра, які трымаўся з 1937 года, дажджоў падчас антыцыклону не было) на Віцебшчыне сабралі каля 780 тысяч тон збожжавых. Сярэдняя ўраджайнасць — 25,5 цэнтнера з гектара. Кіраўнік вертыкалі выканаўчай улады Падзвіння заўважыў, што пры гэтым дзяржаўны заказ будзе выкананы.

«Адчуваецца недабор па ўсіх сельскагаспадарчых культурах, але гэта негатыўна не паўплывае на жывёлагадоўлю, бо кампенсуецца шматгадовай травой, нядрэнна развіваецца кукуруза, — запэўніў ён. Пайшлі дажджы, фарміруецца дастаткова нядрэнны кукурузны пачатак, таму будзем працаваць з кукурузай на зерне. Недабор бульбы таксама не паўплывае на харчовы рынак. У цэлым, думаю, насельніцтва не адчуе наступстваў сёлетніх анамалій надвор'я».

Пацярпелі ўсе раёны, сказаў Мікалай Шарснёў. У якасці прыкладу ён прывёў Аршанскі: калі ў лепшыя гады тут збіралі каля 150 тысяч тон збожжа, то сёлета — усяго 108,7 тысячы тон. «Дык гэта найлепшыя землі. Што тады гаварыць пра тыя раёны, дзе ў асноўным гліністыя глебы? Канешне, там сур'ёзныя страты. Але аграрыі, як і кожны год, дакладна выканалі сваю місію перад народам і перад краінай. Ужо ідзе фарміраванне ўраджаю наступнага года», — працягнуў старшыня аблвыканкама.

Сёлета, чаго ніколі раней не было, асобныя сельскагаспадарчыя арганізацыі завяршылі ўборку ўжо 1 жніўня. Раней уборачныя работы пачыналіся каля 10 жніўня. Само жыццё прымушае сялян мяняць стратэгію. «Трэба зрабіць так, каб перанесці аб'ём нагрузкі са жніўня і верасня на чэрвень і ліпень. Ёсць намер змены пасяўных плошчаў асобных сельскагаспадарчых культур. Трэба абавязкова зменшыць плошчы пад уборку зерневых з улікам нарыхтоўкі кармоў для жывёлы», — удакладніў Мікалай Шарснёў.

Крэн будзе зроблены на значнае павелічэнне плошчы для азімых, задумана паменшыць плошчы ярavога рапсу, каб дрэннае дажджлівае надвор'е восенню не перашкаджала аграрыям. Плануецца ўпершыню вырошчваць азімы ячмень.

Поўнач краіны вядомая спецыялізацыяй на льнаводстве, а ў Оршы функцыянуе адзін з найбуйнейшых льнокамбінатаў у Еўропе. Кіраўнік рэгіёна быў рады падзяліцца аператыўнай інфармацыяй наконт нарыхтоўкі льнотрасты: «Самы высокі нумар 1,09 — на Віцебшчыне, а ў цэлым па краіне — 0,92. Сёлета добрае валакно, каляровасць цудоўная. З палёў ужо сабралі льнотрасты ў два разы больш, чым летась». Ураджайнасць меншая, але якасць будзе лепшая.

Аналізуючы дзейнасць льнозаводаў, старшыня аблвыканкама пахваліў дубровенскае прадпрыемства, якое, у адрозненне ад іншых, даўно ўжо працуе прыбыткова.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

Педсавет

# БРЭНДЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

## Вучнёўская моладзь Гродзеншчыны рэалізоўвае новыя праекты

**Самыя цікавыя з іх прадстаўлены падчас рэспубліканскага Тыдня ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Як аказалася, спектр інтарэсаў даволі шырокі: ад ініцыятыў маладзёжнага парламента да аўтарскіх праектаў, якія скіраваны на развіццё асобы, творчых здольнасцяў і падрыхтоўку да дарослага жыцця.**

Як адзначыў **намеснік галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр МАЦЮШОНАК**, дадатковая адукацыя павінна быць даступнай, эфектыўнай і якаснай. Традыцыйны штогадовы Тыдзень дадатковай адукацыі якраз і павінен паказаць, наколькі гэта сістэма гатова да новага вучэбнага года.

Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Руслана АБРАМЧЫКА**, у рэгіёне сістэма работы ў гэтым кірунку ўдасканальваецца. Значныя змены адбыліся ў апошнія гады. У многіх установах праведзены капітальныя рамонты, адкрыты спартыўныя залы і басейны. Падчас пандэміі асвоена альтэрнатыўная форма работы ў рэжыме анлайн. Педагогі праводзяць такім чынам майстар-класы, вядуць вучэбныя блогі. У рэгіёне працуюць аб'яднанні, якія ўдзяляюць вялікую ўвагу патрыятычнаму выхаванню, павышэнню экалагічнай культуры і прапагандзе здаровага спосабу жыцця. Таксама папулярнасцю сярод дзяцей і моладзі карыстаецца валанцёрства.

Самыя цікавыя праекты былі прадстаўлены падчас Тыдня дадатковай адукацыі ў абласным Палацы творчасці дзяцей і моладзі. Інтэрактыўныя пляцоўкі размясціліся па кірунках дзейнасці. Напрыклад, некалькі ініцыятыў прадставіў маладзёжны парламент пры Гродзенскім абласным Савеце дэпутатаў. Адным з брэндаў стаў праект «Маршруты здароўя», калі некалькі раз на год усе дэпутаты маладзёжнага парламента ездзяць па вобласці, праводзяць флэшмобы, спартыўныя спаборніцтвы, сустрэчы, знаёмяцца з маляўнічымі куткамі прыроды роднага краю. Нядаўна ў маладзёжным парламенце нарадзіўся праект «Мова краіны маёй». Было створана звыш 100 відэаролікаў з дэкламацыяй беларускай паэзіі ў выкананні самых розных жыхароў рэгіёна.

Ёсць у маладзёжным асяроддзі і конкурс прадпрымальнікаў, які праводзіць культурна-асветніцкі дабрачынны фонд, створаны пры маладзёжным парламенце. Сюды прыходзіць моладзь, каб прыдумаць і прадставіць свае праекты, а таксама абмеркаваць новыя ідэі.

Шырока распаўсюджваюцца валанцёрскія і інклюзіўныя ініцыятывы. У гэтым сэнсе выклікае цікавасць сацыяльны праект «Казкі ад Алеся». Яго аўтар Аляксандр Каравайчык невыпадкова заняўся казкатэрапіяй. Сам ён выхаванец дзіцячага дома і ведае, як важна падтрымаць і стварыць добры настрой у маленькіх слухачоў. Ён прыходзіць да іх са сваёй фетравай гульнятэкай, у якой самыя розныя персанажы, і разам з дзецьмі стварае новую казку. У ліку інклюзіўных можна назваць і праект па рэканструкцыі батлеечнай школы пачатку XX стагоддзя. Яго стварылі навучэнцы Мірскага мастацкага каледжа, якія выязджаюць са сваім лялечным тэатрам у інтэрнаты і дзіцячыя дамы.




У раздзеле турыстычна-краязнаўчай дзейнасці прыцягваюць увагу прыгожыя макеты гродзенскіх храмаў. Усе яны створаны з удзелам школьнікаў. У адным выпадку — дзеці з бацькамі, у другім — дзядуля з унукам, у трэцім — выкладчык з вучнямі. Матэрыялы — папера, дрэва, гліна... Такім чынам знайшлі ўвасабленне касцёл Святой Тройцы ў вёсцы Шылавічы Ваўкавыскага раёна, знакаміты Сынкавіцкі храм-крэпасць, царква святога Аляксандра Неўскага ў Крэве, Гродзенскі Свята-Пакроўскі сабор, храм у Жыровічах і многія іншыя. Усяго ў конкурсе прыняло ўдзел каля 70 макетаў. Метадыст цэнтра турызму і краязнаўства Вікторыя Каўцэвіч расказала, што цяпер установа рыхтуе новы конкурс. Гэтым разам увага ўдзяляецца старым і адноўленым сядзібам, якія з'яўляюцца аб'ектамі гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Вывучэнне адукацыйных традыцый свайго краю працягваюць у Шчучынскай гімназіі. Па словах настаўніцы гісторыі Алены Лісоўскай, горад быў вядомы з XVIII стагоддзя калегіумам ордэна піяраў, дзе бясплатна вучылі юнакоў грамаце. А ў 1903 годзе тут з'явілася царская настаўніцкая семінарыя. У ёй цяпер месціцца гарадская гімназія. Адукацыйны кірунак выліўся ў шэраг цікавых праектаў. Адным з іх стала ўзнаўленне па старых гравюрах друкаванага станка часоў Францыска Скарыны. Яго ўнікальнасць у тым, што гэты станок працуе, і тут нават друкуюць лісты «пад старажытнасць».

А вось у Шчучынскім палацы творчасці, які належаў некалі Друцкім-Любецкім, школьнікі арганізавалі клуб «Чайная сустрэча». Тут нават абсталявана спецыяльнае ўтульнае памяшканне. Фітаклуб стаў і месцам сустрэч, і майстар-класаў. Асабліва папулярная травяная гарбата. І гэта невыпадкова. Клуб супрацоўнічае з мясцовым саўгасам «Вялікае Мажэйкава», які спецыялізуецца на вырошчванні лекавых раслін — рамонку і календулы. Тут мяркуюць узнавіць рэцэпт зёлкавых настояў былых уладальнікаў палаца. Праект скіраваны на развіццё кулінарнага турызму. І гэта не адзіны «чайны» праект. З традыцыямі чаявання знаёмяць у музеі Навагрудскай спецшколы-інтэрната для дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Тут сабраны прадметы чайнай цырымоніі многіх краін свету. А работнікі інтэрната разам з дзецьмі нарыхтоўваюць лекавыя травы, каб частаваць духмяным настоем падчас сумесных збораў.

Інавацыйны напрамак набывае экалагічны профіль. Напрыклад, у Лідзе арганізавалі Школу юнага ветэрынара з трохузроўневым навучаннем. Апошні этап — практыка ў адной з ветэрынарных клінік. Школьнікі дапамагаюць выратоўваць прадстаўнікоў фаўны, якія атрымалі траўмы. Валанцёрскай дзейнасцю займаецца Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, а ў гродзенскай СШ № 12 працуе музей-лабараторыя ашчадных гаспадароў. Кіраўнік па даследчай рабоце Іларыён Лахніцкі расказаў аб энергазберагальных праектах. Самыя галоўныя — аўтаматызаваная цяпліца і пункт аўтаматычнага ўпраўлення школьнымі званкамі. Спецыяльны блок уключае званкі і святло па праграме праз інтэрнэт. Гэта значна эканоміць электраэнергію. Абодва праекты атрымалі дыпломы конкурсаў тэхнічнай творчасці сярод моладзі.

Даволі цікавая студыя займае вольны час і вучняў СШ № 16 горада Гродна. Тут працуюць з горнымі пародамі і мінераламі — іх здрабняюць у ступцы, а потым распісваюць крошкай выявы. **Кіраўнік студыі «Каменная казка» Таццяна СЕРДЗЮКОВА** нават прапанавала правесці майстар-клас з удзельнікамі Тыдня дадатковай адукацыі і знайшла нямала ахвотных. Мінералы, якімі распісваюць на аснове клею, самыя розныя: лазурыт, малахіт, яшма, мармур розных адценняў, графіт, кварц. У мінулым годзе тут распачалі праект па інклюзіўнай дзейнасці дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Праект адзначаны дыпломам. Падчас Тыдня дадатковай адукацыі сваё майстэрства прадэманстравалі дзіцячыя музычныя і танцавальныя калектывы.

Усяго падчас прэзентацыі інтэрактыўных пляцовак было прадстаўлена звыш дваццаці праектаў. Па словах дырэктара Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Надзеі Васільчанкі, на Гродзеншчыне дзеці атрымліваюць максімальнае пазашкольнае развіццё, яны ўдзельнікі, лаўрэаты і пераможцы многіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Кветкі Радзімы

# Валошка ўпрыгожвае новую карону «Міс Беларусь — 2021»

**Васямнаццацігадовая, высокая, стройная шатэнка з карымі вачыма — гэта вобраз Дар'і Ганчарэвіч, якую ў мінулую пятніцу журы абрала эталонам жаночай прыгажосці і ўзнагародзіла каронай «Міс Беларусь — 2021». Пераможца самага жаноцкага конкурсу краіны працуе мадэллю і выкладчыкам дэфіле ў Нацыянальнай школе прыгажосці, марыць стаць арганізатарам Тыдня моды ў Беларусі.**



Для пераможцы зрабілі новую карону з белага золата з россыпам тапазаў і брыльянтаў і са стылізацыяй кветкі валошкі. Карону Дар'я Ганчарэвіч атрымала, абышоўшы 29 фіналістак шоу. А яно на самай справе было чароўным. Упрыгожвалі фінал міла-відныя дзяўчаты на сцэне, дызайнерскія касцюмы, захапляльная сцэнаграфія, выступленні таленавітых айчынных і замежных артыстаў. Канцэпцыю шоу ў Палацы спорту «Міс Беларусь — 2021» задалі беларускія легенды і святы. Аўтары фіналу паказвалі прыгажосць беларускіх жанчын праз прыгажосць іх краіны.

Місію выбраць самую лепшую з роўных усклалі на журы. Старшынстваваў ў ім оперны спявак Уладзімір Громаў і дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці Алена Троіцкая. У складзе таксама дэпутат, «Міс Беларусь — 2018» Марыя Васілевіч, гендырэктар «Крышталь-Холдынг» Руслан Саракавы, старшыня Маладзёжнага савета Ягор Макарэвіч, рэктар БДУКМ Наталля Карчэўская, дацэнт кафедры БДАМ Канстанцін Касцючэнка, кампазітар Яўген Алейнік, балерына Вольга Гайко, гандбаліст Сяргей Рутэнка і «Міс Сусвет» Аксана Фёдарава.

Выбраць найлепшую — задача амаль невыканальная. Гэта на пачатку фіналу пацвердзіў **кампазітар Яўген АЛЕЙНІК.** Але назваў крытэрыі, якія дапамогуць яму вызначыцца з рашэннем. Прыгажосць будучай «Міс Беларусь» — гэта сукупнасць знешнасці і духоўных якасцяў. «З мяне так сабе член журы, бо беларускія дзяўчаты — прыгажуні. Як можна выбіраць? Наколькі я зразумеў па рабоце журы, прыгажуню выбіраюць па сукупнасці. Вельмі важны духоўны складнік асобы, сацыяльная дзейнасць. Многія дзяўчыны займаюцца грамадска карыснымі справамі і гэтым выбіваюцца з іншых», — сказаў Яўген Алейнік.

**Пераможца конкурсу «Міс Расія» і «Міс Сусвет» Аксана ФЁДАРАВА** адзначыла, што для кожнай з дзяўчат удзел у фінале ўжо вялікі крок, з якога можа пачацца выдатная будучыня.

«Усе дзяўчаты, якія выйшлі ў фінал, безумоўна, валодаюць бездакорнымі знешнімі вартасцямі. Але гэтага недастаткова. На сцэне павінна гучаць мелодыя душы. Дзяўчына павінна ўмудрыцца за кароткі час сваімі рухамі, сцэнаграфіяй, харэаграфіяй, пластыкай паказаць, што ў яе ўнутры. Каму гэта ўдаецца, хто зможа пераадолець хваляванне, паказаць сваю харызму, той і выбіваецца ў лідары», — сцвярджае член журы.



Аздаблялі шоу акрамя дэфіле прыгажунь перабіўкі, што перадавалі атмасферу за кулісамі, размовы вядучых з удзельніцамі і залай. Дарэчы, з-за пандэміі новую уладальніцу тытула «Міс Беларусь — 2021» давялося чакаць не два гады, а тры. Таму, верагодна, і білетаў на фінал не было ўжо за тыдзень да конкурсу.

Большасць гледачоў на трыбунах Палаца спорту ў пятніцу вечарам — балельшчыкі: бацькі, сябры і сакурснікі фіналістак шоу. Падтрымаць дзяўчат прыехаў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Верагодна, самымі гучнымі і актыўнымі балельшчыкамі былі гледачы з Інстытута культуры і мастацтваў. Зразумела, іх рэктар у складзе журы, а некалькі студэнтак — на сцэне.

Менавіта гледачы дапамаглі журы праверыць прамоўніцкія якасці і знаходлівасць дзяўчат. Пытанні разнастайнай тэматыкі: ад аб'ёму ВУП краіны да любімых літаратурных аўтараў прагучалі з залы. Былі яны загадзя зрэжысіраваныя альбо не — невядома. Але нават калі прыгажуні ведалі пытанні загадзя, патрэбна мужнасць, каб спакойна, упэўнена і без хвалявання адказаць.

Генеральным партнёрам мерапрыемства стаў «Банк развіцця», а арганізатарам конкурсу традыцыйна выступілі тэлеканал «АНТ», Міністэрства культуры і Нацыянальная школа прыгажосці.

Як паведамілі арганізатары, галоўная прыгажуня Беларусі ў падарунак атрымае салідную грашовую прэмію, аўтамабіль «Белджы» і правы прадстаўляць краіну на «Міс свету» ў Пуэрта-Рыка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**Фота БелТА.**



Навінкі кнігавыдання

# «АСОБА І ЧАС»:

## Кнігавыдавец Ліліяна АНЦУХ

**У нашай краіне добрай вядомасцю карыстаецца прыватнае кніжнае выдавецтва «Чатыры чвэрці», якое заснавала і якім кіруе Ліліяна АНЦУХ. Сярод многіх цікавых выданняў, падрыхтаваных калектывам і яго аўтарамі, — творчы праект «Асоба і час».**




Раней у гэтай серыі пабачылі свет кнігі, прысвечаныя дзеячам культуры, літаратуры, асветніцтва. Былі выдадзены зборнікі, якія расказваюць пра Анатоля Аўруціна, Сяргея Галаўко, Міколу Макарцова, Міхася Пазнякова, Алеся Савіцкага, Навума Гальпяровіча, Уладзіміра Гніламёдава, Васіля Макарэвіча, Міхася Дрынеўскага, Янку Сіпакова, Юлію Чурко.

Толькі што друкарскі варштат падарыў чытачу яшчэ адну кнігу серыі «Асоба і час» — «Ліліяна Анцух: «Не лічыць крокі свае...»: артыкулы, эсэ, інтэрв'ю, вершы».

Як нарадзілася гэта кніга, расказвае сама гераіня, а ў некаторых тэкстах — і аўтар, інтэрв'юер, суразмоўца многіх журналістаў, пісьменнікаў, якіх прыцягнуў феномен выдавецтва «Чатыры чвэрці» і генератара гэтай культурніцкай з'явы ў сучаснай беларускай культуры. «Дарагі чытач, знаёмы і незнаёмы! Прызнаюся Вам, ідэя выдаць гэтую кнігу, відаць, засталася б толькі ў думках, калі б не дадзенае шмат гадоў таму абяцанне. Прагучала яно ў 2003 годзе з нагоды святкавання 10-годдзя выдавецтва «Чатыры чвэрці» ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, што знаходзіцца на Музычным завулку ў Мінску. Тады кожны з прысутных атрымаў у падарунак невялічкую, падрыхтаваную менавіта да гэтага мерапрыемства кнігу са шматабяцаючай назвай «О Вас, или Черновик будущей книги». У прадмове я напісала, што «Черновик» абавязкова стане грунтоўнай кнігай.

Але ў мітусні дзён час прабег непрыкметна, і ўжо нават адсвяткавана 25-годдзе выдавецтва. Каб стрымаць слова, вымушана была паміж іншымі справамі ўзяцца за працу над кнігай. Раздумваючы, якой ёй быць, вырашыла скласці структуру такім чынам, каб разам са шматлікімі фотаздымкамі ў яе ўвайшлі і мае апублікаваныя ў перыядычных выданнях артыкулы, матэрыялы, што былі напісаны для розных выданняў. Адабрала таксама найбольш цікавыя інтэрв'ю, што бралі журналісты.

Скажу шчыра, перачытванне старых артыкулаў было заняткам вельмі захапляльным — быццам зноў праходзіла па жыцці і... паступова складалася першая частка кнігі. У другой — крыху распавяла пра асабісты лёс».

Выдавецтва бярэ свой пачатак з 1993 года. За гэты час да чытача прыйшлі дзясяткі, сотні выданняў, якія ўсе разам ствараюць партрэт сучаснай беларускай культуры, сучаснай беларускай літаратуры. Многія кнігі носяць такі выразны характар, што не ўзнікае ніякіх сумненняў, што яны павінны былі з'явіцца менавіта ў выдавецтве «Чатыры чвэрці». У асобе кіраўніка Ліліяны Анцух многія пісьменнікі, даследчыкі, аўтары бачаць лідара, здольнага заўважыць самыя каштоўныя ініцыятывы, вартыя шырокай увагі. Невыпадкова сваімі развагамі пра выдавецтва і Ліліяну Анцух дзеляцца вядомыя ў краіне людзі: Юлія Чурко, Навум Гальпяровіч, Мікалай Чаргінец, Іван Міско, Генадзь Пашкоў, Леанід Дранько-Майсюк...

Выданне багата ілюстраванае, што таксама прыцягвае ўвагу да кнігі. А мне ў падрабязным выкладанні лёсу асобы Л. Анцух у кніжнай справе бачыцца і наступная акалічнасць. Праз кнігу, якая ўжо прыйшла да чытача, вылучаецца яшчэ адзін важкі для сучаснай кніжнай справы клопат — варта пісаць, складаць гісторыю беларускага кнігавыдання. Навошта пакідаць гэтую справу на заўтрашні дзень?!. Статыстыка па колькасці кніг, якія штогод выдаюцца ў Беларусі, высокія адзнакі беларускім кнігам на конкурсе «Мастацтва кнігі Садружнасці Незалежных Дзяржаў», новыя тэндэнцыі ў кнігавыданні, надзвычай цікавыя, багатыя на ўдзельнікаў міжнародныя кніжныя выстаўкі, якія штогод ладзяцца ў Мінску, іншыя праявы ў кнігавыдавецкай галіне, кніжным гандлі — яскравае сведчанне таго, што варта пісаць гісторыю, занатоўваць для нашчадкаў сучаснасць у звязку з Яе Вялікасцю Кнігай. І выдавецтва «Чатыры чвэрці» — асобны вялікі Востраў у гэтай прасторы. Востраў, які мае сваю гісторыю. Будзем верыць, што яна і надалей, яшчэ больш падрабязна будзе занатоўвацца. А грунтоўны пачатак кнігай пра Ліліяну Анцух у серыі «Асоба і час» ужо пакладзены.

**Раман СЭРВАЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ (ИНФОРМАЦИЯ) О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# Государственное предприятие «МГЦН» 15 октября 2021 года проводит 316-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества / сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – ОАО «ДОРОРС»**, тел. +375 (17) 240 62 06 | | | | | | |
| 1 | г. Минск, ул. Бобруйская, 23-1Н | 293,7 | 3,0 | 1240,88 | Под торговый объект продовольственной и непродовольственной группы товаров, объект общественного питания, оказание услуг населению, иные цели, возможные для размещения на данном объекте | Изолированное помещение. **Срок аренды – 3 года** (1*) |
| 2 | г. Минск, ул. Чкалова, 16-3Н | 98,1 | 3,0 | 414,47 | Под торговый объект продовольственной и непродовольственной группы товаров, оказание услуг населению, иные цели, возможные для размещения на данном объекте | Изолированное помещение. **Срок аренды – 3 года** (1*) |
| | *1* Имеются центральное отопление, водопровод, канализация центральная, горячее водоснабжение, электроснабжение. После заключения договора необходимо застраховать сдаваемое в аренду недвижимое имущество за счет средств арендатора в пользу арендодателя* | | | | | |
| 3 | г. Минск, ул. Казинца, 103А | 11,1 | 2,0 | 46,90 | Под оказание услуг по прокату и иные цели, возможные для размещения на данном объекте | Часть капитального строения (здания специализированного для общественного питания). **Срок аренды – 3 года** (2*) |
| | *2* Имеются отопление местное на твердом топливе, водопровод центральный, канализация местная, электроснабжение. После заключения договора необходимо застраховать сдаваемое в аренду недвижимое имущество за счет средств арендатора в пользу арендодателя* | | | | | |
| **Арендодатель – ООО «КэпиталБилдинг»**, тел. +375 (29) 606 09 26 | | | | | | |
| 4 | г. Минск, ул. Судмалиса, 1Г | 10,0 | 15 евро за 1 кв. м без НДС (*) | 50,00 | Под торговый объект, объект общественного питания | Нежилое изолированное помещение № 5 временного сооружения в составе объекта строительства «Временный объект торговли и общественного питания в районе пересадочного узла «Восточный» – станция метро «Пролетарская». **Срок аренды – 1 год** (3*) |
| | *3* Техническое описание помещения: помещение является временным строительным объектом (не является капитальным строением), к помещению проведено электроснабжение, возможность монтажа системы вентиляции – монтаж и подключение к коммуникациям производится за счет арендатора без последующей компенсации стоимости затрат. Техническое улучшение помещения, а также текущий ремонт осуществляются за счет средств арендатора и последующей компенсации не подлежат.* <br> ** Арендная плата подлежит уплате в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день совершения платежа* | | | | | |
| **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский,** тел.: +375 (17) 225 61 21, 225 69 77 | | | | | | |
| 5 | г. Минск, пл. Привокзальная, 5 | 1,0 | 2,0 БАВ | 8,45 | Под размещение стеллажа буккроссинга | Площадь (согласно схеме) в главном корпусе Северного железнодорожного вокзала (отметка +8,550, 3-й этаж). **Срок аренды – 3 года** (4*) |
| | *4* Имеются центральное отопление, пожарная сигнализация и видеонаблюдение, включенные в общую систему вокзального комплекса, общий вход. В ТЦ «Галилео» имеется платная парковка. Рядом расположены остановки городского транспорта, пригородного сообщения, автовокзал, станция метро «Площадь Ленина». Необходимые условия: после заключения договора аренды: разработать и согласовать с арендодателем эскиз стеллажа, соответствующий современному облику вокзального комплекса, застраховать имущество, заключить договор на электроснабжение, установить камеры видеонаблюдения, соблюдать все эпидемиологические меры. Все работы за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат* | | | | | |
| **Арендодатель – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений,** тел. +375 (163) 49 51 46 | | | | | | |
| 6 | Гродненская область, Свислочский район, Свислочский с/с, ст. Свислочь, 1 | 4,9 | 3,0 | 20,70 | Под организацию розничной торговли, размещение офиса (сотрудников), оказание услуг | Помещение в одноэтажном здании железнодорожного вокзала. **Срок аренды – 3 года** (5*) |
| | *5* Имеются теплоснабжение, электроснабжение. В договоре аренды будет предусмотрено одним из условий расторжения договора по требованию (арендодателя) производственная необходимость. Помимо договора аренды с арендатором будут заключены договоры о взаимоотношениях в части электроснабжения и теплоснабжения. От арендатора требуется: получение технических условий, разработка проектной документации с установкой прибора учета электрической энергии в соответствии с Правилами электроснабжения, оформление документации на электроснабжение в установленном порядке с оформлением акта осмотра инспекцией Энергонадзор и предоставление его арендодателю. Все работы за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат* | | | | | |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Аукцион состоится **15 октября 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 15 сентября 2021 г. по 12 октября 2021 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе:**

к участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка по соответствующему предмету аукциона, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Для участия в аукционе лица, желающие участвовать в нем, подают организатору заявления на участие в аукционе с приложением следующих документов:

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) по соответствующему предмету (соответствующим предметам) аукциона на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 316 от 15.10.2021 по предмету аукциона № ___. Сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов;

• копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

• копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

**При подаче заявления на участие в аукционе:**

физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, желающие участвовать в аукционе, предъявляют документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет: документ, удостоверяющий личность; доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель; документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), – если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, составленные на иностранном языке, должны представляться (предъявляться) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариально).

**Порядок определения победителя аукциона**

Аукцион по его предметам № 1–4 проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности, утвержденным организатором аукциона (далее – Порядок).

Аукцион по его предметам №№ 5, 6 проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион по каждому предмету аукциона начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

**Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):**

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

**Дополнительная информация:**

базовая арендная величина (БАВ) с 01.04.2019 по 31.03.2022 составляет 16,90 рубля;

возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Положением или Порядком, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона);

договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом), заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22, бухгалтерия – + 375 (17) 366 36 58, отдел аренды – + 375 (17) 373 47 29.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

# Извещение о проведении 27 сентября 2021 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МЗАЛ имени П.М. Машерова»

**Сведения о продаваемом имуществе**

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-10091 общей площадью 4 293,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18/13, наименование – модельный цех со складом моделей (лит. Е 1-2/к), назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения) | Общее долевое право постоянного пользования на земельный участок площадью 19,0241 га, кадастровый номер – 500000000001002170 | 1 454 040,0 | 145 000,0 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-47411 общей площадью 2 881,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18/12, наименование – корпус очистных сооружений, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения | | 1 019 760 | 101 000,0 |
| 3 | Капитальное строение* с инвентарным номером 500/С-52784 общей площадью 10 546,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18/8, наименование – литейный цех, назначение – здание специализированное для металлургического производства и металлообработки | | 3 459 960,0 | 345 000,0 |
| **Часть капитального строения (назначение – ЦРП) площадью 156,9 кв. м, примыкающая к зданию литейного цеха с инвентарным номером 500/С-52784, не подлежит сносу или переносу и является неотъемлемой частью ОАО «МЗАЛ имени П.М. Машерова»* | | | | |

**Продавец имущества:** ОАО «МЗАЛ имени П.М. Машерова», ул. Долгобродская, 18, 220037, г. Минск

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МЗАЛ имени П.М. Машерова», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 27.09.2021 по предмету торгов № _.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **27 сентября 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.09.2021 по 23.09.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 664 60 02.

**Телефоны для справок:** (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 358 69 02, (029) 664 60 02 (ОАО «МЗАЛ имени П.М. Машерова».

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

# УТРЫМАЦЦА НА ПЛАВУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

...Спачатку Мікалай папрасіў адтэрміноўку плацяжу за арэнду ўсяго на месяц. Рэзкае закрыццё межаў прывяло да імгненнага спынення грашовых паступленняў на рахунак яго турыстычнай кампаніі, а трэба было выплаціць заробак супрацоўнікам, дапамогу дэкрэтніцам, да таго ж на носе былі штомесячныя плацяжы па падатках. Арэндадаўцы з разуменнем паставіліся да просьбы Мікалая, бо яго кампанія аказалася сярод тых, што больш за іншых пацярпелі ад абмежаванняў, звязаных з пандэміяй.

— Здавалася, усё гэта ненадоўга, — прызнаецца **Мікалай КАЯЛА, кіраўнік кампаніі «Юніверс-Трэвэл»**. — Але неўзабаве прыйшло ўсведамленне, што пандэмія зацягваецца, і справы ў нас ідуць вельмі дрэнна. Я нясу адказнасць не толькі за свой бізнес, але і за супрацоўнікаў, у якіх ёсць сем'і. Каб зберагчы калектыў, прынялі рашэнне перавесці супрацоўнікаў на чвэрць стаўкі. Але разумение таго, што на 125 рублёў (прыкладна столькі сталі атрымліваць супрацоўнікі) проста не выжыць, прымушала мяне шукаць выйсце і магчымасці дапамагчы людзям. Мы чакалі дапамогі дзяржавы, некаторыя сталі звальняцца.

Арэндадаўцы разумелі, з чым сутыкнуліся турфірмы, і ішлі насустрач, давалі растэрміноўкі на арэнду офісаў, некаторыя не патрабавалі аплаты ўвогуле ў самы востры перыяд. А ва ўрадзе якраз рыхтавалі дакумент аб падтрымцы эканомікі падчас пандэміі.

— Калі прымалі пакет стабілізацыйных мер, урад і Нацбанк арыентаваліся на неабходнасць стварэння такіх умоў у няпростай эпідэміялагічнай абстаноўцы, каб прадпрыемствы не спынялі сваю работу, — расказвае **намеснік міністра эканомікі Дзмітрый ЯРАШЭВІЧ**. — Першы блок мер меў на мэце падтрыманне фінансавай устойлівасці прадпрыемстваў, забеспячэнне іх своечасовай дзяржпадтрымкай і крэдытнымі рэсурсамі. Мы вызначылі пералік галін, найбольш уразлівых ва ўмовах абвастрэння эпідэміялагічнай сітуацыі. Усе яны маглі скарыстацца падтрымкай у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 красавіка 2020 г. № 143 «Аб падтрымцы эканомікі». Акрамя таго, суб'ектам гаспадарання далі магчымасць неналічэння амартызацыі ў 2020 годзе, растэрміноўкі па выплаце дывідэндаў за 2019 год, пераносу курсавых розніц на даходы (выдаткі) будучых перыядаў. Нацбанк у сваю чаргу прымаў меры рэгулятарнага паслаблення. Дадаткова кропкава падтрымліваліся асобныя прадпрыемствы. Другі, не менш важны кірунак, — сацыяльная падтрымка грамадзян. З бюджэту былі кампенсаваны выдаткі на зарплату работнікаў бюджэтных арганізацый, якія ў звычайнай сітуацыі фінансаваліся за кошт іх уласных даходаў, а медыкам і сацработнікам устаноўлены надбаўкі да заробку за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.



Таксама ў 2020 годзе арганізацыі змаглі атрымаць субсідыі для даплат да памеру «мінімалкі» работнікам у сувязі з прастоем або няпоўным працоўным часам па ініцыятыве наймальніка і, адпаведна, даплат узносаў у ФСАН. Менавіта гэтай падтрымкай і скарыстаўся Мікалай Каяла.

— Памятаю, нам далі тады згоду на даплаты супрацоўнікам, — успамінае бізнесмен. — Паколькі ў чэрвені 2020-га наш калектыў працаваў на 1/4 стаўкі (каля 125 рублёў), то па факце многія атрымалі зарплату меншую за мінімальную, якая на той час складала 375 рублёў. Субсідыя дазволіла кампенсаваць гэтую розніцу.

> У Міністэрстве эканомікі растлумачылі, што падтрымка бізнесу ў складаны перыяд пандэміі насіла комплексны характар. Прадпрымальнікам даваліся ў асноўным адтэрміноўкі і растэрміноўкі, зніжаліся выплаты па падатковых і арэндных плацяжах, аплаты прададзенай з растэрміноўкай дзяржмаёмасці, а таксама стаўкі адзінага падатку для ІП, пералічвалася запазычанасць за энергарэсурсы.

— Каб быць больш канкрэтным, прывяду некалькі лічбаў: у мінулым годзе пералічана запазычанасць за энергарэсурсы на 114,5 мільёна рублёў і дадзены льготы па падатковых і арэндных плацяжах на 65 млн рублёў, — гаворыць Дзмітрый Ярашэвіч. — Адтэрміноўкі, растэрміноўкі, зніжэнне сум падатковых плацяжоў атрымала каля 1,4 тысячы суб'ектаў гаспадарання, ільготы па арэндзе — каля 7,3 тысячы. Акрамя таго, для 42,5 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў былі зніжаны стаўкі па адзіным падатку ў II і III кварталах 2020 года. Больш за тое, у сувязі з распаўсюджваннем другой хвалі каранавіруса дзеянне асобных пунктаў Указа № 143 было падоўжанае. Ужо ў першым паўгоддзі бягучага года падтрымкай скарысталіся каля дзвюх тысяч плацельшчыкаў. Сума дапамогі перавысіла 17,3 мільёна рублёў.

Калі Мікалай Каяла пачуў, што яго кампанія можа атрымаць дапамогу, узрадаваўся, але даведаўшыся аб памерах, вырашыў, што яна будзе недастатковай.

— Гэта было ў самыя цяжкія, першыя, месяцы пандэміі, — успамінае Мікалай. — Аднак час паказаў, што той падтрымкі, якая была аказана з боку дзяржавы, нам хапіла, каб утрымацца на плаву. Але каб выжыць, трэба было і самім яшчэ нешта прыдумаць. У маім выпадку мы звярнулі ўвагу, што некаторыя катэгорыі грамадзян усё ж працягваюць выязджаць за мяжу і маюць патрэбу ў нашых паслугах. Мы сталі дапамагаць афармляць дакументы людзям, якія працавалі за мяжой. З кожным месяцам з'яўлялася ўсё больш магчымасцяў для перасячэння мяжы, таму пацяху працавалі... Канешне, у нас па-ранейшаму ёсць даўгі перад арэндадаўцамі. Але мы іх закрываем: вось у гэтым месяцы з адным арэндадаўцам цалкам разлічыліся. Праўда, з аднаго офіса нам прыйшлося сысці. Але пандэмія не будзе доўжыцца вечна. Спадзяёмся, што, як толькі адкрыюць мяжу, наша кампанія будзе гатова да гэтага, і мы хутка адновімся.

— Дзесьці чвэрць суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў той ці іншай меры скарысталіся падтрымкай дзяржавы, — лічыць **сустаршыня праўлення, дырэктар Бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага Жанна ТАРАСЕВІЧ**. — Акрамя таго, бізнес перафарматаваў сваю дзейнасць, пачалі з'яўляцца новыя віды сэрвісаў. Напрыклад, дыстанцыйная работа, дастаўка ежы і лекаў, навучанне і кансультаванне з дапамогай рознага кшталту інтэрнэт-рэсурсаў і лічбавых тэхналогій, новыя віды страхавання. Бізнес пачаў больш думаць аб кааперацыі адзін з адным, у працэс кіравання пачалі ўключацца самі работнікі, а таксама рэалізоўваць розныя сацыяльныя праграмы, што станоўча паўплывала на лаяльнасць кліентаў. Пандэмія дала сапраўдны імпульс для значнага руху наперад у засваенні лічбавых тэхналогій. І яшчэ адзін момант: як бы мы першапачаткова не ставіліся да таго, што ў краіне не ўведзены лакдаўн, але і тут час паказаў, што рашэнне было правільным і гэта станоўча паўплывала на захаванне бізнесу. Аказалася, што пандэмія — не толькі шлях да крызісу, але і магчымасць для развіцця.

У Мінэканомікі паведамілі, што па выніках мінулага года ВУП краіны знізіўся на 0,9 працэнта. Але, для параўнання, у большасці еўрапейскіх краін і Расійскай Федэрацыі, дзе ўводзіліся лакдаўны, падзенне ВУП было больш значным: у Расіі — 3 працэнты, Еўразоне — 6,5 працэнта. Дзякуючы прынятым мерам у краіне ўдалося значна змякчыць уздзеянне на эканоміку пандэміі і падтрымаць прадпрыемствы і працоўныя калектывы.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

## Фінансы

### ПРАВЕРКА ВЕДАЎ ПА-НОВАМУ

**У Рэспубліканскай алімпіядзе па фінансавай адукаванасці змогуць прымаць удзел усе навучэнцы незалежна ад класа навучання.**

У адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку правядзення рэспубліканскай алімпіяды па фінансавай адукаванасці, зацверджанай сумеснай пастановай праўлення Нацыянальнага банка і Міністэрства адукацыі, удзел у алімпіядзе могуць прымаць школьнікі, якія асвойваюць змест адукацыйных праграм базавай, сярэдняй адукацыі, а таксама спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі. У папярэднія гады алімпіяда праводзілася толькі сярод школьнікаў 10—11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Сёлета алімпіяда пройдзе ў чатыры этапы: 1) ва ўстановах адукацыі — у верасні; 2) раённы этап — 15 кастрычніка; 3) абласны (Мінскі гарадскі) этап — 19 лістапада; 4) заключны этап — 10 снежня.

Алімпіядныя заданні ўключаюць пытанні ў выглядзе тэстаў з варыянтамі адказаў па наступных тэмах: асабістыя фінансы, наяўныя грошы, зберажэнні, запазычанні, лічбавы банкінг, дзейнасць цэнтральнага банка, страхаванне, падаткі, інвестыцыі.

Для падрыхтоўкі да алімпіяды Нацыянальным банкам распрацаваны метадычныя рэкамендацыі, якія ўключаюць апісанне тэм заданняў, рэкамендаваныя крыніцы інфармацыі, прыклады пытанняў з адказамі і тлумачэннямі. З метадычнымі рэкамендацыямі можна азнаёміцца на адзіным партале фінансавай адукаванасці http://www.fingramota.by.

Арганізатарамі алімпіяды традыцыйна выступаюць Нацыянальны банк і Міністэрства адукацыі. Алімпіяда праходзіць у нашай краіне штогод пачынаючы з 2014-га і з'яўляецца адным з найбольш маштабных нацыянальных мерапрыемстваў па павышэнні фінансавай адукаванасці. За гэтыя гады свае фінансавыя веды ў алімпіядзе змаглі праверыць каля 114 000 школьнікаў, у тым ліку летась — больш за 20 000 старшакласнікаў з 2047 устаноў адукацыі.

### У ЦЭНТРЫ МІНСКА АДКРЫЛІ МУЗЕЙ ГРОШАЙ

**Ён месяцца ў галаўным офісе аднаго з камерцыйных банкаў краіны і прадстаўляе банкноты і манеты, пачынаючы з другога стагоддзя нашай эры.**



Займальная калекцыя знаходзіцца на вуліцы Камуністычнай, 49 — насупраць гасцініцы «Беларусь». Тут прадстаўлены як старадаўнія банкноты і манеты, так і сучасныя грошы. Напрыклад, рымскія дынарыі II–III стагоддзя нашай эры, грошы і паўгрошы перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, а таксама талеры патагоны (іспанскія Нідэрланды) пачатку XVII стагоддзя. Ёсць у экспазіцыі манеты Савецкага Саюза, падборка памятных манет Нацбанка.

З цікавага для нумізматаў — рэдкая серыя сучасных беларускіх банкнот, дзе на кожным з наміналаў стаіць аднолькавы нумар. Такіх набораў было выпушчана ўсяго тысяча штук. Акрамя таго, экспазіцыя ўключае папяровыя грошы Расійскай імперыі перыяду Мікалая II, Савецкага Саюза, а таксама ўсе банкноты Беларусі пачынаючы з «зайчыкаў».

Выстаўку можна наведаць у будні дні з 9.00 да 19.00. Нагадаем, музей грошай Groshi створаны на аснове прыватнай калекцыі Андрэя Місько. У экспазіцыі ўвагі — гісторыя ўсяго грашовага абароту, якая мае адносіны да тэрыторыі Беларусі. У экспазіцыі прадстаўлены толькі арыгінальныя прадметы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Добрая навіна

### ДЛЯ ПАСПЯХОВАГА ЛЯЧЭННЯ

**Новы кіслародна-размеркавальны вузел уведзены ў эксплуатацыю ў Брэсцкай гарадской бальніцы № 1.**

Аб тым, як установы аховы здароўя Брэста паляпшаюць матэрыяльна-тэхнічную базу для лячэння пацыентаў з каранавируснай інфекцыяй, расказаў у тэлеграм-канале **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.**

Напрыклад, у першай гарадской бальніцы завершаны работы па ўвядзенні ў эксплуатацыю кіслародна-размеркавальнага вузла. Праведзена поўная рэканструкцыя кіслароднай сеткі бальніцы, яе магістральных трубаправодаў. Устаноўлены два рэзервуары вадкага кіслароду па пяць тон у якасці асноўнай крыніцы кіслародазабеспячэння.

Усяго ў бальніцы цяпер арганізавана 226 кіслародных пунктаў, што дазваляе забяспечыць стабільную падачу кіслароду для пацыентаў, якія праходзяць лячэнне.

На гэтую работу патрачана 1,5 мільёна рублёў з гарадскога і абласнога бюджэтаў. У далейшых планах — рэканструкцыя і пераасншчэнне аперацыйнага блока ўстановы аховы здароўя «Брэсцкая гарадская бальніца № 1».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# МОЙ МІНСК — МОЙ ЛЁС

Дзень нараджэння горада мінчане і госці сталіцы пачалі святкаваць з самай раніцы, ва ўсіх раёнах прайшлі розныя мерапрыемствы, прысвечаныя важнаму святу. Адной з такіх пляцовак стала тэрыторыя, прылеглая да Палаца спорту, дзе для гасцей была арганізавана канцэртная праграма, а таксама розныя забавы і пачастункі.

Мабыць, адным з самых відовішчных і запамінальных стаў комплекс мерапрыемстваў, падрыхтаваных МНС Рэспублікі Беларусь. Гледачы змаглі азнаёміцца з выратавальнай тэхнікай і паўдзельнічаць у шматлікіх конкурсах. Акрамя таго, на пляцоўцы каля Палаца спорту прайшлі спаборніцтвы сярод супрацоўнікаў МНС «Наймацнейшы пажарны-ратавальнік». Для гэтага была ўзведзена цэлая паласа перашкод, якую і мелася пераадолець камандам-удзельніцам...

Калі прайсці крыху далей, то можна трапіць да Беларускага Дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны. Там таксама ладзіліся святочныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня горада.

Акрамя канцэртнай праграмы, была прадстаўлена выстаўка ваеннай тэхнікі, дзе можна было пазнаёміцца яшчэ са зброяй, экіпіроўкай, а таксама са службовымі сабакамі.

У гарадскім палацы культуры 12 верасня адбыўся X гарадскі фестываль творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі «Мастацтва жыць, тварыць мастацтва».

— Дзясяты раз мы спяваем і танчым для любімай сталіцы. Правядзенне фестывалю «Мастацтва жыць, тварыць мастацтва» ў рамках святкавання Дня горада ўжо стала добрай традыцыяй. Гэта яшчэ адно пацвярджэнне таго, што кожны чалавек у нашым горадзе, краіне мае роўныя правы і магчымасці, — падкрэсліла на адкрыцці свята **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна РАМАНОВІЧ.**

Летась фестываль з-за пандэміі было вырашана не праводзіць. Затое сёлета ён прайшоў асабліва ярка і святочна. Яснае і сонечнае надвор'е дазволіла разгарнуць канцэртную пляцоўку на адкрытым паветры. Гэта стварае асаблівую атмасферу. А да ліку гледачоў далучае новых ахвотных.

...Займальныя дзеянні праходзілі не толькі на сцэнах. На пляцоўцы каля ўвахода ў Мінскі гарадскі палац культуры разгарнулася выстаўка-продаж вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія ствараюць людзі з інваліднасцю. Можна было набыць арыгінальныя вырабы з саломкі, мяккія цацкі, дэкаратыўныя лялькі, карціны, упрыгажэнні ды іншае. Упершыню на фестывалі была прадстаўлена прадукцыя спецыялізаваных працоўных майстэрняў (адкрыліся ў сталіцы сёлета ў ліпені) «ЗдольныЯ» для інвалідаў I і II груп.

У гарадской ратушы адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання членаў добраахвотных дружын і саветаў грамадскіх пунктаў ахвовы правапарадку.

На мерапрыемстве таксама прысутнічалі ганаровыя госці — **старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ** і яго **намеснік Арцём ЦУРАН, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь** і **інспектар па г. Мінску Аляксандр БАРСУКОЎ, пракурор г. Мінска Алег ЛАЎРУХІН, начальнік ГУУС Мінгарвыканкама Міхаіл ГРЫБ, начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Сяргей САЛАНОВІЧ**, кіраўнікі раённых адміністрацый, РУУС сталіцы і многія іншыя.






Фота БелТА.

**Уладзімір КУХАРАЎ:**

— Ужо стала добрай традыцыяй напярэдадні Дня горада ўшаноўваць людзей, якія, не лічачыся з асабістым часам, уносяць велізарны ўклад у ахову правапарадку і прафілактыку правапарушэнняў. Вельмі важна, што вы ўдзяляеце шмат увагі выхаванню маладога пакалення, бо тым самым ствараеце трывалы падмурак нашай будучыні.

З упэўненасцю магу сказаць: Мінск — самы бяспечны горад у Еўропе, дзе ў любы час сутак можна адчуваць сябе абароненым.

Пасля цырымоніі ўзнагароджання свае музычныя нумары прысутным падарылі салістка духавога аркестра ГУУС Мінгарвыканкама Ганна Благава, ансамбль «Песняры» і іншыя.

Велічны горды Мінск сустракаў свята ва ўсёй красе. Гэта сучасны горад, які дынамічна развіваецца. Аднавіўшы ў першапачатковай прыгажосці гістарычныя будынкі і захаваўшы народныя традыцыі, ён набыў вопыт, энергію і ўпэўнена глядзіць у будучыню. Адольваючы трывогі і разбурэнні мінулых стагоддзяў, горад быў і застаецца сэрцам нашай краіны і ўсеагульным гонарам. Нам, сучасным жыхарам, ужо цяжка ўявіць, праз што давялося прайсці гераічным продкам, каб мы сёння маглі будаваць, выхоўваць дзяцей, мірна жыць у гэтым маляўнічым месцы. Сёння Мінск старажытны і адначасова малады. Чысты і ўтульны, ён не пакідае абыякавым да сваёй прыгажосці нікога, хто ў нас пабываў. Гэта наш горад, наша сталіца, наша сэрца. Мы ганарымся сваім мінулым і верым у шчаслівую будучыню.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

---

Падзея

## Мінскі паўмарафон — 2021 адбыўся ў сталіцы

# АБ'ЯДНАНЫЯ БЕГАМ

**Яркі, актыўны, доўгачаканы... Сёлета самы масавы спартыўны забег шосты раз сабраў усіх аматараў бегу і здаровага спосабу жыцця. Пандэмія каранавіруса ўнесла свае карэктывы, і колькасць бегуноў на мінскіх вуліцах была меншая, чым звычайна. На старт дыстанцый у 10 і 21 кіламетр выйшла па 3000 чалавек. Самай масавай традыцыйна стала дыстанцыя ў пяць кіламетраў — яе прабеглі 4000 чалавек.**

На атмасферы свята эпідэміялагічныя карэктывы ніяк не адбіліся. Усмешкі, пазітыў і добры настрой так і засталіся візіткамі Мінскага паўмарафону.

«Відаць, як людзі засумавалі не стольк па спартыўных, колькі па масавых мерапрыемствах, бо гэта аб'ядноўвае. У нас цяпер Год народнага адзінства, і такіх мерапрыемстваў вельмі не хапае. Добра, што прайшоў Мінскі паўмарафон, тым больш у Дзень горада», — адзначыў **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК**. Дарэчы, міністр таксама пераадолеў дыстанцыю ў 10 кіламетраў. Па яго словах, траса Мінскага паўмарафону вельмі няпростая, няроўная, таму бегчы цяжкавата. Але з правільнай падрыхтоўкай пераадолець яе абсалютна рэальна.

### «РАЗУМЕЛА, ШТО БУДЗЕ НЯЛЁГКА»

Яркасці і эмоцый Мінскаму паўмарафону дадае і спаборніцкая частка. У першую чаргу, гэта спартыўнае свята. І хоць тых, хто прайграў, тут няма, але імёны пераможцаў вядомыя. Найлепшы вынік на самай папулярнай дыстанцыі ў пяць з паловай кіламетра паказалі **Уладзіслаў Церашонак** і **Настасся Дзедзікава**. Першымі да фінішу на дыстанцыі ў 10 кіламетраў прыбеглі **Аляксандр Санько** і **Вольга Камінская**. Найлепшымі на галоўнай, паўмарафонскай, дыстанцыі ў 21 кіламетр сталі **Ніна Савіна** (Беларусь) і **Віталь Шафар** (Украіна).

Для Ніны Савінай перамога ў Мінскім забегу ўжо не першая. У 2019 годзе яна таксама перамагла на дыстанцыі 21 кіламетр з вынікам 1 гадзіна 11 хвілін 24 секунды і ўстанавіла рэкорд трасы. Сёлета Ніна пераадолела дыстанцыю за 1 гадзіну 11 хвілін 37 секунд. І гэта праз месяц пасля марафону на Алімпійскіх гульнях у Токіа. «Я вельмі ляў, Ніна пасля алімпіяды наўрад ці будзе бегчы з усяе сілы. «Я заўсёды выходжу на трасу з думкамі пра перамогу. Канешне, я разумела, што будзе нялёгка, тым больш што Марына сапраўды рыхтавалася, яна свежая і бадзёрая. Але ў мяне атрымалася», — пракаментавала Ніна.

Свваімі сакрэтамі бегавой падрыхтоўкі падзяліўся і **старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Іван ЦІХАН.**




шчаслівая, тым больш што быць пераможцам дома — гэта заўсёды ганарова. Траса цяжкая, сілавая, але мне гэта ўдалося! Я ведала, што пасля марафону ў Токіа будзе цяжка прабегчы яшчэ палавінку», — сказала Ніна.

На дыстанцыі 21 кіламетр галоўнай яе канкурэнткай была Марына Даманцэвіч, удзельніца Алімпійскіх гульняў 2016 года. І многія чакалі перамогі менавіта ад яе, маўЁн скарыў дыстанцыю ў пяць кіламетраў. «Я аматар, я не магу гаварыць аб прафесіяналах. Першы сакрэт — не трэба прымушаць сябе, трэба любіць бегаць. Ну, а калі вы любіце і паважаеце сябе, то заўсёды будзеце займацца здароўем. Знаходзьце час, каб трохі прабегчыся або па лесвіцы пахадзіць. Любіце сябе, паважайце і займайцеся спортам, асабліва лёгкай атлетыкай, бо нездарма яе называюць каралевай спорту», — падкрэсліў ён.

### «НЕ БОЙЦЕСЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ!»

Паколькі Мінскі паўмарафон пастаянна развіваецца і ўдасканальваецца, без нававўвядзенняў не абышлося. Галоўная навінка гэтага года — анлайн-забег. Кожны ахвотны мог зарэгістравацца на сайце, прабегчы дыстанцыю, скінуць арганізатарам трэк прабежкі і атрымаць па пошце медаль. Медалі мінскага забегу папоўняць яшчэ больш скарбонак у розных краінах свету. Такім чынам, у Мінскім паўмарафоне прыняло ўдзел каля 500 чалавек.

**Галоўны каардынатар Мінскага паўмарафону, генеральны сакратар Беларускай лёгкай атлетыкі Вераніка ГРЭСЬ** — не проста арганізатар забегаў, а іх актыўны ўдзельнік. Яна параіла кожнаму не баяцца дыстанцый Мінскага паўмарфону і абавязкова ўдзельнічаць.

Мінскі паўмарафон працягваецца хоць і некалькі гадзін, але ніколі не заканчваецца. Удзельнікі пастаянна трэніруюцца да наступнага забегу, а арганізатары думаюць, як зрабіць яго лепшым. Магчыма, дзякуючы любові да бегу ад удзельнікаў і энтузіязму арганізатараў у Мінску пройдзе і цэлы марафон у 42 кіламетры. Вераніка Грэсь расказала, што правесці яго цяжка, але цалкам рэальна: «У нас шмат думак і ідэй. І якраз адна з іх — марафон. Разумеем, што траса цяжкая, але мы думаем над гэтым. Можа, не ў 2022 годзе, а крыху пазней. Нават калі ўдзел у ім прыме невялікая колькасць чалавек, гэта ўжо будзе крок наперад. Практычна ў кожнай сталіцы сучаснай дзяржавы ёсць свой марафон. Чаму яго не можа быць у Мінску? Мы будзем імкнуцца і нарошчваць тэхнічны патэнцыял, каб выводзіць наш любімы забег на новы ўзровень. Будзем станавіцца лепшымі».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

Новы сезон

# ПРЫ ПОЎНАЙ ЗАЛЕ

## Прывіды коннікаў і слуцкія паясы: Вялікі тэатр адкрыў сезон операй «Дзікае паляванне караля Стаха»

**Верасень пачаўся, а гэта значыць, што тэатры зноў працуюць ва ўсю моц. Стартуюць чарговыя тэатральныя сезоны: гледачоў чакаюць прэм'еры і любімыя пастаноўкі. Мы ўжо пісалі пра Вялікі тэатр Беларусі, які анансаваў шмат цікавых спектакляў, а таксама выступленні замежных артыстаў. Як і абяцалася, новы, 89-ы, тэатральны сезон у Вялікім пачаўся операй «Дзікае паляванне караля Стаха».**

Нягледзячы на тое, што мы трапілі на пастаноўку на другі дзень, вольных месцаў у зале не было — прыйшлося глядзець і слухаць оперу стоячы. Але гэта і добра, бо поўная зала сведчыць аб зацікаўленасці гледачоў, да таго ж менавіта беларускамоўнай операй. Забягаючы наперад, адзначым, што мова ў «Дзікім паляванні караля Стаха» гучыць неверагодна! Сумна прызнаваць, але опер на роднай мове не надта шмат.





Калі казаць дакладней, прэм'ера пастаноўкі адбылася 11 і 12 ліпеня гэтага года. А гісторыя оперы пачалася значна раней, калі ў сярэдзіне 1980-х беларускі кампазітар Уладзімір Солтан паказаў некалькі музычных фрагментаў дырыжору Яраславу Вашчаку. Амаль праз год сумеснай працы опера была створана. Некаторыя фрагменты «Дзікага палявання караля Стаха» прагучалі ў лютым 1989 года ў Клубе сяброў оперы. Сама прэм'ера адбылася крыху пазней, 6 красавіка таго ж года. Але ёсць і сумныя дэталі: Вашчак не дажыў да прэм'еры ўсяго месяц, музыку Солтана значна скарацілі. І ўсё ж «Дзікае паляванне караля Стаха» жыве і па сёння. Глядзячы на сёлетнія пастаноўкі, жыве добра.

Але вернемся ў сучаснасць: запоўненая глядзельная зала, са сцэны гучыць беларуская мова. Чым жа яшчэ адметная сёлетняя пастаноўка? Ценямі. На працягу ўсёй оперы цень — адзін з асноўных сімвалаў, які адлюстроўвае настрой. Зразумела, што і «Дзікае паляванне караля Стаха» Караткевіча, і аднайменны фільм Валерыя Рубінчыка — гэта містычная гісторыя, напоўненая трывогай і схаваным, прыцішаным жахам, які вось-вось вырвецца вонкі. Відаць, падчас стварэння пастаноўкі і вырашылі, што цень паслужыць добрым інструментам, які дапаможа перадаць тую самую трывогу. Атрымалася. Сілуэты птушак, дрэў, маланак ды абстрактных фігур не даюць героям забыцца аб тым, што іх жыццё ў небяспецы.

З таксама цікавых сцэнаграфічных рашэнняў можна адзначыць прывідных коннікаў. Яны вісяць над зямлёй гэта не візуальная падманка. Сапраўды, аб'ёмныя фігуры імчаць над сцэнай. Мы глядзелі оперу з балкона, і нават адтуль прывіды коннікаў выглядаюць рэалістычна.

Пасля прачытання арыгінала, а таксама прагляду фільма складана не параўноўваць: хоць гэта і розныя формы творчасці, але ўсё ж несвядома шукаеш паралелі. Уласна мне падалося, што колеры оперы вельмі падобныя да каларыстыкі фільма Рубінчыка. Асабліва на пачатку: пануе не сіне-шэрых адценняў і імглістасць Палесся. Таксама цікава было гадаць, да якога мастацкага кірунку адносяцца дэкарацыі. Ці то да позняга рамантызму, ці то да готыкі. Канешне ж, тут можна разважаць лагічна. І калі дзея адбываецца ў канцы XIX стагоддзя, то, напэўна, павінны панаваць прэрафаэліты, якія апявалі натуральную, рамантычную, шэкспіраўскую прыгажосць. Мне ўсё ж такі падаецца, што і дэкарацыі, і касцюмы артыстаў уяўляюць сабой сумесь розных напрамкаў. Але ёсць рэчы, глядзячы на якія не трэба гадаць: у сцэнаграфіі выкарыстоўваліся колеры і матывы слуцкіх паясоў. А ў касцюмах артыстаў здзейснілі прыём рэканструкцыі: некаторыя прынты адсылаюць да беларускіх абразоў XV—XVI стагоддзяў.

Безумоўна, сцэнаграфія даволі моцна паглыбляе нас у атмасферу таямнічнасці і неспадзяванасці дзікага палявання. Але ў оперы ёсць яшчэ адзін важны элемент, без якога нічога не атрымалася б. Гэта музыка: то ціхая, далікатная, то рэзкая, абрывістая, а ў кульмінацыйныя моманты — гучная і надрывістая. Трэба падзякаваць дырыжору-пастаноўшчыку Андрэю Іванову. А вось са сцэн, якія найбольш запомніліся, хацелася б адзначыць баль у гонар дня нараджэння юнай паненкі Надзеі Яноўскай. На свята завітвае і пан Рыгор Дубатоўк (апякун Надзеі), і Андрэй Беларэцкі, і Алесь Варона. За некалькі хвілін артысты адлюстроўваюць амаль усе чалавечыя іпастасі. Гледачоў кідаюць з пампезнай бальнай залы ў халодны, пыльны пакой: адбываецца сварка паміж Беларэцкім і Варонам. Прыгожая сцэна з пункту гледжання і акцёрскага майстэрства, і стылістычнага выканання.

У вераснёўскай афішы тэатра опера «Дзікае паляванне караля Стаха» больш не пазначана. Але супрацоўнікі не раз прызнавалі, што пастаноўка, у параўнанні з іншымі, ідзе даволі рэдка. І кожны раз мае вялікі поспех. Таму раім адсочваць навіны Вялікага тэатра Беларусі і хутчэй набываць квіткі на оперу: дзея, якая разгортваецца на сцэне, насамрэч незвычайная. Больш за тое, заўсёды цікава паглядзець на знаёмую гісторыю ў іншым выкананні. А пакуль чакаем вяртання караля Стаха, можна звярнуцца да любімага Караткевіча.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.**

Мясцовы брэнд

# САМЫ ВЯЛІКІ АМЛЕТ

## можна было пакаштаваць у мінулую суботу ў Гарадку на фестывалі «Мара ласуна – 2021»



**Мерапрыемства на маляўнічым беразе возера Лугавое ва ўрочышчы «Вараб'ёвы горы» стала цікавай акцыяй выхаднога дня. Тым больш што гэтае месца ў Гарадку — вельмі прыгожы куточак, дзе ў сямейным і сяброўскім коле прыемна бавіць час у любую пару года. Надвор'е было спякотнае, пагроза дажджу — нулявая, тым чынам арганізатараў (Гарадоцкі раённы выканаўчы камітэт і мясцовая птушкафабрыка) прырода не падвяла.**

Упершыню фэст прайшоў у пазамінулым годзе ў кастрычніку. І тады, і сёлета, каб убачыць свята, узяць у ім удзел, некаторыя прыехалі з Віцебска і не толькі. Летась з-за эпідэміялагічных абмежаванняў яго не было. Сведкі першага кажуць, што сёлетняе свята аказалася больш масавым. Ды і насамрэч першая палова верасня — час лепшы для вулічных мерапрыемстваў у параўнанні з сярэдзінай восені.

Сярод ганаровых гасцей быў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, які, дарэчы, у абласным парламенце прадстаўляе інтарэсы жыхароў Гарадоччыны. Дэпутат падпісаў разам з іншымі афіцыйнымі асобамі «памятны ліст» у гонар правядзення свята. Гэта стала навінкай на «Мары ласуна».

Праграма фестывалю была багатая. Сярод цікавых забаў і гульняў — шоу-конкурс «Пеўневыя забегі», спартыўная эстафета «Яечнае мнагаборства», «Свята прыгажосці і стылю» — ZOO-конкурс «Гарадоцкая цыпа — 2021», выстаўка арт-аб'ектаў «Фестывальнае яйка».

Цэнтральнае месца ў праграме займалі кулінарныя конкурсы: дзіцячы «Вясёлыя паварчукі» (па прыгатаванні страў з вараных яек), «Фестывальны торт» — сярод кандытараў-аматараў, а таксама конкурс па прыгатаванні яечні з перапёлчыных яек на калодзе «Сняданак для гурмана».

Сярод кухараў-прафесіяналаў была праведзена кулінарная бітва па вырабе страў з мяса індычкі на адкрытым агні. Гэтае мяса, як і яйкі, усё больш папулярнае сярод спажыўцоў і вельмі карыснае для здароўя. Адна з задач гарадоцкага мерапрыемства — папулярызаваць мясцовую прадукцыю птушкафабрыкі і іншых вытворцаў, у прыватнасці — вінаграднага смажа, якога разводзяць у аграрнай сядзібе. Гэты далікатэс пажадалі пакаштаваць многія.



У канцы фестывалю зрабілі, як сцвярджаюць арганізатары кулінарнага перформансу, самы вялікі амлет у Беларусі: з 1800 яек — на спецыяльна зробленай квадратнай патэльні.

Многае тут адбывалася і па-за кулінарнай тэмай, працавалі творчыя лакацыі. У прыватнасці, свае вырабы прадэманстравалі рамеснікі, майстры народных промыслаў, юныя ўдзельнікі гурткоў. Да пунктаў, дзе можна было вымераць крывяны ціск, узровень кіслароду ў крыві, дзе вучылі аказваць неадкладную медыцынскую дапамогу, стаялі чэргі. Самадзейныя артысты ўзнімалі настрой. Невысокімі цэнамі прыемна здзіўлялі кавярні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
*г. Гарадок.*
**Фота аўтара.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества Автотранспортного унитарного предприятия «Забудова-Автотранс»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1. Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-50532, площадь 3 128,3 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание ремонтных мастерских | Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 8/1, вблизи п. Чисть | 649 238,10 | 64 923,81 | 32 461,91 |
| | 2. Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-19265, площадь 964,5 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, хранилищ, наименование – административно-бытовой комплекс | Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 8, вблизи п. Чисть | | | |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-54920, площадь 56,2 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание автозаправочной станции на 120 заправок; с составными частями и принадлежностями согласно техническому паспорту | Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, 8, вблизи д. Плебань | 139 603,77 | 13 960,38 | 6 980,19 |

В отношении лота № 1 проводятся четвертые повторные торги. Стоимость снижена на 65 %.
Ранее объявление размещалось в газете «Звязда» № 88 (29457) от 13.05.2021, № 124 (29493) за 02.07.2021, № 145 (29514) от 31.07.2021, № 162 (29531) от 25.08.2021.
В отношении лота № 2 проводятся вторые повторные торги. Стоимость снижена на 25 %.
Ранее объявление размещалось в газете «Звязда» № 131 (29500) от 13.07.2021, № 162 (29531) от 25.08.2021.

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Лот № 1 расположен на земельном участке площадью 3,7752 га с кадастровым номером 623886007698000001, по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 8, вблизи п. Чисть. Назначение – земельный участок под производственную зону в п. Чисть Молодечненского района. Предоставлен на праве постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.<br>Лот № 2 расположен на земельном участке площадью 1,1565 га с кадастровым номером 623881700098000009, по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, 8, вблизи д. Плебань (целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания автозаправочной станции) а также земельные участки с кадастровыми номерами: 623800000098006032, (0,0001 га), 623800000098006031 (0,0015 га), 623800000098006035 (0,0001 га), 623800000098006034 (0,0006 га), 623800000098006039 (0,0001 га), 623800000098006038 (0,0001 га), 623800000098006037 (0,0001 га), 623800000098006033 (0,0001 га), 623800000098006036 (0,0001 га), 623800000098006040 (0,0001 га), 623800000098006041 (0,0001 га), 623800000098006042 (0,0001 га), на которых расположены составные части объекта. Земельные участки предоставлены на праве постоянного пользования. Переход прав на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь |
| **Обременения (ограничения)** | Лот № 1 имеет обременение в виде ипотеки, правообладатель – ОАО «Белвнешэкономбанк».<br>По вопросам обременений обращаться по тел. +375293953088 (Илья) |
| **Дата и время проведения торгов** | **24 сентября 2021 года в 14.00 (регистрация с 13.30 до 14.00)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | С 10.00 **14 сентября 2021 года** до 16.00 **23 сентября 2021 года** |
| **Условия для участия в торгах** | 1. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by/info.<br>2. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по Лоту №_, принадлежащему УП «Забудова-Автотранс», проводимых 24.09.2021.<br>3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).<br>4. Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. Вознаграждение аукциониста составляет 5 % от конечной цены предмета торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.<br>5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться к Борису Юрьевичу +375 29 326-16-12.<br>7. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.<br>8. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет |
| **Информация о продавце** | **Автотранспортное унитарное предприятие «Забудова-Автотранс» в лице ликвидатора – ООО «ФИБЛ» (Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4, УНП 600468334)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении третьих повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ТРИУМФСТРОЙ» (УНП 190465926, г. Минск, ул. Л. Украинки, д. 16, каб. 6), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов*: 29 сентября 2021 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 14 сентября 2021 года по 27 сентября 2021 года.
***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:* ООО «ТРИУМФСТРОЙ» (УНП 190465926)** в лице антикризисного управляющего – директора частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, рублей без учета НДС | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161391, назначение-машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-126, площадь – 17,8 кв. м | **12 000,00** | **5 %** | **5 %** |
| 2 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161392, назначение-машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-135, площадь – 17,3 кв. м | **12 000,00** | **5 %** | **5 %** |
| 3 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161393, назначение-машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-137, площадь – 16,1 кв. м | **12 000,00** | **5 %** | **5 %** |
| 4 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161404, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-149, площадь – 13,2 кв. м | **11 450,00** | **5 %** | **5 %** |
| 5 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161398, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-150, площадь – 13,1 кв. м | **11 450,00** | **5 %** | **5 %** |
| 6 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161399, назначение-машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-151, площадь – 13,3 кв. м | **11 450,00** | **5 %** | **5 %** |
| 7 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161400, назначение-машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-152, площадь – 13,3 кв. м | **11 450,00** | **5 %** | **5 %** |

**Для участия в торгах необходимо:**

1. В срок до 16.00 **27 сентября 2021 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16.00 27.09.2021 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

**Сведения о предыдущих торгах:**
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 69 (29438) за 14.04.2021.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 113 (29482) за 17.06.2021.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 146 (29515) за 03.08.2021.

## Извещение о проведении 06 октября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ВИЛИЯ»

| Предмет торгов |
|---|
| Изолированное помещение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/D-708053898 общей площадью 1913,8 кв. м (наименование: административно-производственное с фотостудией; назначение: помещение многофункциональное) |
| Местонахождение: г. Минск, ул. Фабричная, 22-9 |
| Начальная цена: 2 828 142,82 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 282 814,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** закрытое акционерное общество «ВИЛИЯ», ул. Фабричная, 22-9, 220033, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ВИЛИЯ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе 06.10.2021.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона при условии оплаты вознаграждения за организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в следующем порядке: 50 процентов от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение 10 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи; оставшаяся сумма оплачивается не позднее 100 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **06 октября 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 16.09.2021 по 04.10.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефонам: (029) 623-70-80, (029) 556-14-50.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(029) 159-24-94 (ЗАО «ВИЛИЯ»).**

**Уважаемые акционеры ОАО «МАПИД»!**

**24 сентября 2021 года**
состоится внеочередное общее собрание акционеров

## ОАО «МАПИД»,

расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205.
Собрание созывается по инициативе наблюдательного совета ОАО «МАПИД».
**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, актовый зал (каб. № 39).**

Начало работы собрания – 24 сентября 2021 года, 11.00.

**Повестка дня:**
1. О выплате дивидендов за I полугодие 2021 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 16 сентября по 23 сентября 2021 года по месту нахождения Общества г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. № 303 (расположение в 5-этажном административном здании) с 9.00 до 16.00, 24 сентября 2021 года – по месту проведения собрания с 9.00 до 10.30.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров сформированного на 16 сентября 2021 года.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.30 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
• акционеру общества – паспорт;
• представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100008115

**Администрация.**

УНП 192280260

13 сентября 2021 г. № 38

## О ДОСРОЧНОМ ПОГАШЕНИИ ОБЛИГАЦИЙ первого выпуска ООО «Темпл Сити»

Настоящим Общество с ограниченной ответственностью «Темпл Сити» (регистрационный номер 192280260, местонахождение: 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, ком. 7) (далее – Общество) сообщает о том, что 13 сентября 2021 Общим собранием участников Общества принято решение (Протокол № 52 от 13.09.2021) о досрочном погашении первого выпуска облигаций Общества (регистрационный номер 5-200-02-3064).

Объем погашаемого выпуска – 499 000,00 евро (четыреста девяносто девять тысяч евро 00 евроцентов).

Количество облигаций (штук) – 499.

Дата досрочного погашения – 30 сентября 2021.

Дата формирования реестра владельцев облигаций – 28 сентября 2021.

Директор А.Л.Солонович

# ЗА ПРАВА ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА

## Каля помніка ахвярам косаўскага расстрэлу 17 верасня пройдзе жалобнае мерапрыемства

**У 1927 годзе Косаўскі падпольны райкам КПЗБ узначальваў будучы пісьменнік Піліп Пестрак. У гэты час Юзаф Пілсуцкі заявіў пра ўсталяванне санацыйнага рэжыму на беларускіх землях. Пачаліся арышты палітычных дзеячаў. За кратамі апынуліся многія актывісты сялянска-работніцкай грамады (БСРГ). Імкліва расла колькасць закрытых беларускіх школ і гімназій. Апошняй кропляй цярпення падпольшчыкаў стаў разгром грамады і поўная ліквідацыя арганізацыі.**

Косаўскі падпольны райкам прымае рашэнне адказаць на пералічаныя падзеі маштабнай дэманстрацыяй пратэсту. У трэці дзень лютага 1927 года на рынкавую плошчу ў Косаве прыйшло каля 1600 чалавек. Людзі ішлі з чырвонымі сцягамі, неслі лозунгі накшталт: «Вызваліць рабоча-сялянскіх дэпутатаў! Вызваліць усіх зняволеных!», «Няхай жыве Савецкая Беларусь!». Яны натхнёна пелі «Інтэрнацыянал», іншыя рэвалюцыйныя песні. Потым пачаўся мітынг. Камуністычныя дзеячы выступалі з прамовамі, што знаходзілі водгук у сэрцах дэманстрантаў.

Людзі прыйшлі на мірную дэманстрацыю і выказвалі свае палітычныя погляды выключна мірным шляхам. Але хутка на плошчы з'явіліся ўзброеныя паліцэйскія. І пасля заклику разысціся, на які людзі адказалі песняй, паліцэйскія прымянілі зброю на паражэнне. Шэсць чалавек былі забітыя, 35 атрымалі розныя па цяжкасці раненні.

Пахаванне забітых дэманстрантаў адбылося на наступны дзень і вылілася ў сапраўдную маніфестацыю пратэсту. Косаўскіх рабочых і сялян падтрымалі па ўсёй Заходняй Беларусі. Аператыўна з'явіўся зварот ЦК КПЗБ з заклікам змагацца з санацыйным рэжымам. Польскі ўрад спалохаўся пратэсных настрояў і адправіў кіраўніка горада Косава Уладзіслава Станішэўскага ў адстаўку.

Праз 40 гадоў пасля трагічных падзей у памяць аб іх у Косаве ўстанавілі абеліск. **Старшыня Косаўскага гарвыканкама Леанід ЮДЧЫЦ** расказаў:

— Помнік стаіць фактычна ў цэнтры горада і прымыкае да вуліцы 3 Лютага, у назве якой увекавечаная дата трагічнай падзеі. Не так даўно помнік адрамантавалі і правялі добраўпарадкаванне тэрыторыі. Абеліск даглядаюць супрацоўнікі ЖКГ, шэфства над ім трымае і мясцовая школа.

Кожны год напярэдадні 3 лютага прадстаўнікі грамадскасці, прадпрыемстваў і арганізацый ускладаюць кветкі да падножжа манумента. Да нядаўняга часу ў горадзе жылі сведкі і відавочцы тых падзей. Памяць падтрымліваецца ў сем'ях, чые родныя загінулі альбо пацярпелі падчас косаўскага расстрэлу.

— Сёлета мы прыйдзем сюды і 17 верасня, каб ушанаваць памяць землякоў, якія змагаліся за права на сваёй зямлі людзьмі звацца і аддалі жыццё за вызваленне Заходняй Беларусі, — сказаў Леанід Уладзіміравіч.



**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ДЗЕНЬ І НОЧ БУШАВАЛІ АЗЁРЫ

## Чаму нарачанскія рыбакі паўсталі супраць польскіх улад

*Люблю, калі ў сонцы гарыш пазалотай,*
*Раскінуўшы сінія хваляў палотны,*
*Калі ў непагоду сумуеш маркотна*
*З рыбацкаю песняй, з зялёным чаротам.*
*Люблю твае буры, твае навальніцы.*
*Ў іх чую, бы ў песнях, жыццё маладое.*
*І хочацца блізка грудзьмі прытуліцца*
*Да чорных ад гневу кіпучых прыбояў.*

Гэта радкі з паэмы «Нарач» народнага паэта Беларусі Максіма Танка, якую ён напісаў у 1937 годзе. У творы расказваецца аб падзеях 1935 года, калі супраць польскіх улад выступілі рыбакі Мядзеля і навакольных вёсак. Паэма была надрукавана ў часопісе «Каласы». Але з-за перашкод цэнзуры найбольш вострыя моманты, якія паказвалі барацьбу сялян супраць самавольства ўлад, былі выкраслены. Ды і гэта не дапамагло, часопіс быў канфіскаваны. Толькі ў 1940 годзе ўдалося цалкам аднавіць паэму.

Да бунту і супрацьстаяння рыбакоў падштурхнулі абставіны. Спрадвеку ў Нарачы людзі лавілі рыбу, пакідалі ўлоў для асабістых патрэб, лішак прадавалі. Возера не давала пухнуць з голаду. Аднак летам 1935 года ўлады забаранілі свабодную лоўлю рыбы. А гэта пагражала голадам тысячам сем'яў, паколькі займацца раслінаводствам на Нарачы было марнай справай — пясчаныя глебы, што і мусіла рыбакоў да бунту.

Яшчэ ў 1932 годзе польскі ўрад выдаў закон, паводле якога нацыяналізаваліся рэкі і азёры. У выніку Нарач перайшла пад юрысдыкцыю Дырэкцыі дзяржаўных лясоў, якая аддала яго ў арэнду пану Яблонскаму. Рыбакам прапанавалі ісці да яго наёмнымі работнікамі. Але гэтая прапанова рыбакоў не задаволіла. У чэрвені 1935 года, нягледзячы на забарону і папярэджанні арандатара, яны выйшлі на возера. Прыехала паліцыя, пачала ганяцца за імі, каб адабраць улоў. Але жонкі рыбакоў, якія назіралі за пагоняй, перакулілі паліцэйскую маторную лодку, што пацягнула за сабой праследаванні і судовыя працэсы над удзельнікамі выступлення.

Ды гэта не напалохала сялян. Яны па-ранейшаму выходзілі на возера. Да іх нават прыязджалі павятовы староста з Пастаў, ваявода з Вільні. Яны ўгаворвалі пайсці на работу да арандатара, які будзе забяспечваць прыладамі для лоўлі рыбы. Рыбакі ў адказ запатрабавалі замест возера выдзеліць ім прыдатныя для вядзення сельскай гаспадаркі надзелы зямлі. Ім адмовілі.

У выніку выступленняў сялян Яблонскі быў вымушаны пайсці на саступкі, якія, аднак, не задаволілі мясцовых рыбакоў, і ў наступныя гады яны працягвалі арганізавана выступаць за свабодную лоўлю рыбы без арэнднай платы.

«Вясной 1935 года больш як пяць тысяч сялян з 40 навакольных нарачанскіх вёсак аб'явілі ўладам забастоўку. Да лета яны выбралі забастовачны камітэт, сфарміравалі дружыны самаабароны, прагнялі ахову і не дапускалі да возера штрэйкбрэхераў, якімі іх хацелі замяніць. Кіраўніцтва забастоўкай ажыццяўляла Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. Як сведчыць кніга «Памяць. Мядзельскі раён», па заданні ЦККПЗБ на возера тайна прыехалі член Маладзечанскага камітэта партыі Аляксандра Счасная, інструктар Аляксандр Багданчук. У чэрвені 1935 года быў створаны забастовачны камітэт, у які ўвайшлі найбольш аўтарытэтныя і актыўныя рыбакі. Удзельнікаў выступленняў не палохалі ні пагрозы, ні арышты, барацьба працягвалася, і давалі паспяхова. Гэта прызнала і буржуазная газета «Слова»: «Барацьба сялян закончылася перамогай, паколькі яны выкарысталі прамаруджванне дырэкцыі і ўсе як адзін выйшлі лавіць рыбу без ніякага дазволу», — расказалі ў музеі народнай славы.

Барацьбу рыбакоў Нарачы падтрымалі рыбакі Браслаўскіх азёр, Віленскага ваяводства. Пра канфлікт стала вядома ў Варшаве. Газета «Варшаўскі дзённік» у 1936 годзе пісала : «У выніку канфлікту паміж рыбакамі і Дырэкцыяй дзяржаўных лясоў, пад ціскам салідарнай барацьбы сялян дырэкцыя фактычна адмовілася ад правоў уладальніка возера».

Гістарычнае паўстанне рыбакоў на Нарачы — падзея, якая навечна захавалася ў памяці жыхароў азёрнага краю і якой яны ганарацца. Гэта адна з яркіх старонак нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага народа на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Дата адна, а вуліц многа

## У Гродзенскай вобласці не адзін іх дзясятак носіць назву «17 Верасня»

**Колькасць сімвалаў ушанавання гэтай даты невыпадковая. Як вядома, увесь Гродзенскі рэгіён з 1921 года ўваходзіў у склад Польшчы. Тут чакалі прыходу Чырвонай Арміі, які і пачаўся 17 верасня 1939 года. Літаральна за некалькі дзён Гродзенская вобласць разам з іншымі рэгіёнамі была аб'яднаная ў адну краіну. Водгукі тых падзей знайшлі адлюстраванне ў тапонімах. Можна сказаць, што дата 17 верасня — самая распаўсюджаная ў назвах вуліц.**



**Алея помнікаў на вуліцы 17 Верасня ў Свіслачы.**

Напрыклад, у Воранаўскім раёне іх чатыры: у вёсках Бастуны, Нача, Воранаўка і гарадскім пасёлку Радунь. Усе яны атрымалі свае назвы адразу пасля прыходу Чырвонай Арміі. Праўда, не ўсюды захаваліся нейкія звесткі адносна тых падзей. Больш вядомыя гісторыі вуліц у гарадах і раённых цэнтрах.

Назву «17 Верасня» носіць і адна з цэнтральных вуліц Слоніма — буйнога горада Гродзенскай вобласці. Праўда, у мясцовым гісторыка-краязнаўчым музеі аб гісторыі самой вуліцы звестак няма. Магчыма, яе назва не мае гістарычных каранёў. Затое вядомы некаторыя падрабязнасці кампаніі 1939 года. Супрацоўнікі расказалі, што падчас прыходу Чырвонай Арміі адбылося сьвяткаванне на цэнтральнай плошчы горада. Напачатку быў мітынг, потым — народнае гулянне. На сцяне аднаго з дамоў устанавілі палатно і дапазна круцілі савецкія фільмы. Жыхары найбліжэйшых вёсак дасталі аднекуль зброю, вінтоўкі для таго, каб дапамагаць чырвонаармейцам, аднак паліцыя, якая тут знаходзілася, сама пакінула горад. Да гэтага стаялі дзве польскія часці, іх, па ўсёй бачнасці, перакінулі да Брэста. Тут была толькі паліцыя, але і яна ноччу сышла. Бабуля аднаго з супрацоўнікоў музея расказвала, што савецкія войскі ішлі з двух бакоў — па Баранавіцкай шашы і па Ружанскай. Першымі ў горад увайшлі танкі, танкістам кідалі кветкі. Адбылося гэта 18 верасня.

Больш вядома гісторыя вуліцы 17 Верасня ў Свіслачы. Яна згадваецца яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя, а самым вядомым будынкам на ёй была гімназія. Вуліцу называлі гімназічнай, а таксама прафесарскай, бо тут жыла большасць выкладчыкаў, і імем Рамуальда Траўгута, ваеннага і рэвалюцыйнага дзеяча, удзельніка паўстання Каліноўскага. Дарэчы, у яго гонар тут узведзена стэла.

А ў 1939 годзе вуліца атрымала назву 17 Верасня. Здаецца, што яна адлюстроўвае ўсе найважнейшыя перыяды гісторыі мястэчка. Людміла Жук, навуковы супрацоўнік Свіслацкага гісторыка-краязнаўчага музея, паведаміла, як ішло вызваленне будучага райцэнтра. Менавіта 17 верасня 1939 года на яго тэрыторыю ўступілі два браневікі. 19 верасня ўвайшлі часці конніцы і пяхоты. Вызваленчую місію ажыццяўлялі кавалерыйскі корпус Аляксандра Яроменкі і 48-ы полк казацкай дывізіі. На плошчы сабралася ўсё мясцовае насельніцтва, была ўстаноўлена брама з зялёных бярозак, вісеў транспарант: «Дзякуй за вызваленне». Ваенных сустракалі хлебам-соллю. Як сведчаць расповеды відавочцаў, людзі былі рады прыходу савецкай арміі, прапаноўвалі вайскоўцам застацца ў іх на кватэрах. Нейкі час тыя часці, якія вызвалялі горад, стаялі ў Свіслачы. Тады цэнтральная вуліца і атрымала назву «17 Верасня».

Дарэчы, вуліца знакамітая сваёй Алеяй помнікаў. Побач з манументам Траўгуту ў 1944 годзе ўстаноўлены помнік воінам-вызваліцелям, пазней — помнік Леніну і бюст Сталіна, ёсць памятны знак воінам-афганцам. А вось памятнага знака ў гонар 17 верасня пакуль няма.

Затое ён з'явіцца ў Шчучыне. Сёлета тут, на вуліцы 17 Верасня, з'явіцца валун з надпісам: «Гэты знак устаноўлены 17 верасня 1921 года ў гонар Дня народнага адзінства». Падчас свята адсюль пачнецца парад аўтатэхнікі і адбудзецца старт велапрабегу.

Дарэчы, вуліц з такой назвай у Шчучынскім раёне некалькі: у самім райцэнтры, у г. п. Жалудок, вёсках В. Мажэйкава і Дамоўцы.

А ў Гродне на вуліцы 17 Верасня ў гэты дзень адбудзецца культурна-спартыўная праграма з удзелам моладзі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

**Максім ТАНК:**

# «ПРАЛОМ», «КРАТЫ», «НА ЭТАПАХ»



Будынак Вілейскай гімназіі.

***«— Што ў сваёй даваеннай паэзіі вам асабліва дорага?***

***— Першае, што мне дорага, гэта «На этапах», мой самы першы зборнік.»***

**І сапраўды, ужо ў гэтым зборніку выявіўся яскравы талент і творчая смеласць аўтара, аплачаныя выпрабаваннямі, выратаваныя мужнасцю...**

***«Толькі доля шэрай разаткала ніткай***
***Паясок апошні, вузкі паясок...***
***Над жыццём,***
***укрытым арыштанцкай світкай,***
***Расцвітаў зарою сіні васілёк...»***

**Сялянскаму хлапцу Яўгену Скурко з Пількаўшчыны, што апынулася на тэрыторыі панскай Польшчы, шлях да публікацый і першых зборнікаў выдаўся нялёгкі.**

## «НЕ ВУЧОБА, А «ХОЖДЕНИЕ ПО МУКАМ»

*«Вучыцца мне давялося ў польскай пачатковай школе, з беларускай літаратурай амаль не сустракаўся. Пасля вучыўся ў Вілейскай рускай гімназіі, дзе таксама беларускіх кніг не было. Пазнаёміўся з беларускай літаратурай я ўжо ў Радашковіцкай беларускай гімназіі, але я там вельмі мала прабыў. У Віленскай беларускай гімназіі таксама нядоўга правучыўся, мы былі выгнаны за школьную забастоўку. Потым я быў на польскіх меліярацыйных курсах, думаў нават стаць меліяратарам. Гэта дало мне магчымасць зноў паступіць у гімназію, але ўжо не беларускую, а Віленскую рускую, Пушкінскую. Вось такая была вандроўка, не вучоба, а «хождение по мукам»*, — так сцісла апісваў Максім «свае ўніверсітэты».

Усвядоміць, што на той мове, на якой гавораць у тваёй хаце, можна ствараць высокую літаратуру, дапамагалі Купала і Колас: *«Ведаеце, у мяне яшчэ захаваўся Беларускі каляндар 1925 года, які я купіў у гімназістаў з суседняй вёскі, што прыехалі дамоў падчас канікул. У гэтым календары якраз я сустрэў верш Я. Купалы «Вёска»:*

*Лапці ды сярмягі —*
*Як абраз не боскі:*
*Гэта нашы людзі,*
*Людзі нашай вёскі...*

*Якуба Коласа там быў партрэт... Падчас вайны, каб не скурылі партызаны, бацька некаторыя мае паперы і кнігі закапаў у бульбяную яму, дык сёе-тое ацалела...*

*Другой беларускай кнігай, з якой я пазнаёміўся пасля гэтага календара, быў зборнік «Шляхам жыцця»».*

Яўген Скурко, актывіст, камсамолец, падпольшчык, удзельнічаў у святкаваннях юбілеяў Купалы і Коласа, якія шырока ладзіла моладзь Заходняй Беларусі, нягледзячы на забароны і небяспеку. *«Новыя творы Купалы і Коласа публікаваліся на старонках заходнебеларускай перыёдыкі. У мяне захаваліся часопісы «Калосьсе», «Летапіс ТБШ», у якіх змешчаны цэлыя падборкі вершаў народных паэтаў. Шырока адзначаліся юбілеі Я. Купалы і асабліва Коласа. Зараз не помню, якая гэта была гадавіна, я тады прысвяціў Коласу свой верш «Тры песні»*.

А падчас вучобы ў Віленскай пушкінскай гімназіі здарылася і першая публікацыя... Для гэтага давялося зрабіць часопіс самому.

*«У пачатку 1932 года мы з Гарохам па сваёй ініцыятыве выдалі першы нумар «Пралому». Нумар гэты быў багата ілюстраваны Гарохам. Вокладка: на руінах турмы з чырвоным сцягам, азораны праменямі сонца, стаіць рабочы. Друкавалі «Пралом» мы разам, бо і я пасля тэхнічных курсаў мог пісаць рознымі шрыфтамі, што мне потым прыдалося, калі працаваў над «Кратамі» ці па заданню ТК перапісваў турэмныя «грыпсы»*.

Першая публікацыя адбылася пад псеўданімам «А. Граніт». Любіў наш класік мужныя, грувасткія мянушкі... Танкам падпісаўся ў газеце «Беларускае жыццё», выдадзенай 7 красавіка 1932 года ў Львове, пад вершам «Заштрайкавалі гіганты-коміны» пра забастоўку шахцёраў Дамброўскага вугальнага басейна Польшчы. Як сам паэт тлумачыў, *«Максім — гэта ад Горкага, пад уплывам якога мы ўсе тады знаходзіліся. А Танк — нават сам добра не магу растлумачыць, чаму Танк. Як многім пачынаючым паэтам, мне здавалася, што літаратурны поспех залежыць ад гучнага псеўданіма. Свет «раслінных» псеўданімаў быў ужо, што называецца, разабраны: Пушча, Колас, Чарот, Васілёк... Мне нічога не заставалася, як пашукаць што-небудзь «жалезнае», вось я і спыніўся на Танку. Тады я не ведаў яшчэ, што гэта слова мае адносіны да вершаў: танка — адзін з класічных жанраў японскай паэзіі»*.

## «НАС УСІХ ЗАРАЖАЎ ЯГО АПТЫМІЗМ...»

Калі ўгледзімся ў партрэт Яўгена Скурко таго часу, убачым маладога дзёрзкага юнака, з нізка насунутай на вочы кепкай і смелай усмешкай... Можам уявіць, як ён чытае свае вершы ў віленскай кавярні, пад закаханымі позіркамі паненак... Літоўскі паэт Альбінас Жукаўскас успамінаў: *«Як паэт Максім Танк быў самы таленавіты з усіх тагачасных віленскіх паэтаў. Мы ім проста захапляліся. Нас усіх заражаў яго аптымізм, вера ў перамогу, празрыстая народнасць яго вершаў, паэтычная і палітычная спеласць, чыстая беларуская душа, дабрыня, прыгажосць. Цікава, што неўзабаве яго паэзію прызналі нават пераборлівыя, з прэтэнзіямі, надзьмутыя польскія прафесары, якія беларускую, як і літоўскую, мову ды літаратуру лічылі ніжэйшай, «хамскай» мовай і літаратурай»*.

Што ж, калі міністр культуры Скульскі заявіў, што праз дзесяць гадоў у Польшчы са свечкай не знойдуць ніводнага беларуса, менавіта малады Максім Танк напісаў запамінальны і востры адказ:

*Калі няма на свеце маёй мовы,*
*Майго народа і мяне самога,*
*Дык для каго будуеце, панове,*
*Канцлагеры, катоўні і астрогі?*

«Пралом» стаў больш чым гімназічным самаробным альманахам. Другі яго нумар пры дапамозе «старэйшых таварышаў з падполля» быў аддрукаваны на гектографе колькасцю 500 асобнікаў, распаўсюджваўся на Навагрудчыне, у другіх месцах... Трапіў у БССР, і вершы А. Граніта надрукавалі ў «Хрэстаматыі заходнебеларускай літаратуры».

Польскія ўлады рэагавалі таксама: кіраўнік Навагрудскага ваяводства дакладваў у Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, што *«ў шэрагу мясцовасцей Навагрудскага і Слонімскага паветаў пры вобысках у камуністычных дзеячаў знойдзены брашуры з камуністычнымі песнямі альбо сшыткі з перапісанымі вершамі антыдзяржаўнага зместу...»*. Так што хутка Яўгену Скурко давялося брацца за іншы праект... Створаны ў зняволенні.

## «МЯНЕ Ў КАЙДАНАХ ЗАКУТАГА ПРЫГНАЛІ, А ЁН СЯДЗІЦЬ ЗА СТАЛОМ...»

Максіма Танка арыштоўвалі не аднойчы. Першы раз — у красавіку 1932 г., калі ён быў яшчэ гімназістам. Менавіта мінская хрэстаматыя з вершамі А. Граніта стала галоўным доказам. Праз два месяцы маладога паэта выпусцілі пад заклад у 150 злотых, але гімназію скончыць яму не давялося.

Дарэчы, Танк ужо пад канец жыцця прызнаваўся, як спрабаваў у 1932-м перайсці ў БССР... Тады хлопца-камсамольца арыштавалі, пратрымалі два тыдні ў турме і пасля пільнай праверкі адправілі назад, мауляў, смяротнай небяспекі няма, а арганізоўваць камуністычнае падполле камусьці трэба.



Менавіта ў Лукішках, Віленскай турме, Максім Танк і стварыў «Краты»:

*«Будучы ў астрозе, асабліва цяжкімі і доўгімі здаваліся першыя дні. Пасля праведзенай галадоўкі ўсе палітвязні былі пазбаўлены кніг і пісьмовых прылад. Але, не зважаючы на гэта, мне праз крымінальных вязняў удалося атрымаць паперу і чарніла. У канцы 1933 г. я пачаў ад рукі друкаваць першы нумар нашага вастрожнага літаратурна-палітычнага журнала «Краты». Гэта быў своеасаблівы журнал і ў асаблівых умовах ён «друкаваўся». Сядзеў я ў адной камеры з палітвязнем т. Гаўрылічонкам, рабочым з алейнай фабрыкі. Калі я пісаў, ён увесь час мусіў хадзіць па камеры, засланяючы мяне ад «юдата», ад шкляннога вока ў дзвярах, праз якое часта заглядаў дазорца»*.

Паэта выпускалі, пасля зноў хапалі... Працытуем дакумент, які прыводзіў сам Танк: *«Тэлефанаграма №53, В/433. Камендант Дзяржаўнай паліцыі ў Паставах, пастарунак у Сватках, 19.08.1934 года ДЗ 279.34 загадваю неадкладна правесці хатнюю і асабістую рэвізію ў жыхара вёскі Пількаўшчына Мядзельскай гміны сына Яна і Дамінікі, народжанага ў 1912 годзе, западозранага з артыкула 97КК. Незалежна ад вынікаў рэвізіі, названага неабходна затрымаць... Адвесці этапнай дарогай да мясцовай камендатуры»*.

Паэт прайшоў праз выпрабаванні, якія дазвалялі бачыць, хто чаго варты... Ён меў права судзіць тых, хто пасля выстаўляў сябе змагаром за беларускую ідэю.

*«Што, цалавацца з усімі, з людзьмі, якія пальцам торкалі, паказвалі на мяне, Таўлая, Таўпеку, цэлы шэраг нашых пісьменнікаў? Як я магу лічыць вялікім адраджэнцам, скажам, таго ж Бартуля? Дарэчы, пра яго яшчэ не пісаў ніхто. Гэта быў адзін з такіх радыкальных паэтаў. А потым стаў памочнікам суддзі-следчага. Мяне ў кайданах закутага прыгналі, а ён сядзіць за сталом. Мяне дапытваюць, а ён галаву апусціў...»*

## «ДВА ЭКЗЭМПЛЯРЫ Я СХАПІЎ З ДРУКАРНІ...»

У 1936 годзе выйшаў першы паэтычны зборнік «На этапах», які склалі ў асноўным вершы, напісаныя Максімам Танкам у зняволенні.

*Гразнуць змораныя ногі*
*У каляінах...*
*— Што, этап яшчэ далёка? —*
*Раны востра забалелі.*
*......................................*
*Мы ідзем у час найгоршы*
*Смерці, волі на спатканне?*
*Гэта ўжо этап апошні, —*
*Заўтра ўстанем!*

Зразумела, першы зборнік ствараўся з натхненнем. «Ёсць вершы, якія я напісаў за дзесяць хвілін. Напрыклад, *«Памёр стары лірнік...». У час выдання зборніка «На этапах» мне Р. Шырма гаворыць: там трэба выразаць чатыры ці пяць старонак, столькі застаецца пустой паперы. Я за адзін вечар напісаў тады некалькі вершаў — шкада было выразаць...»*

Аднак лёс кніжкі не мог быць лёгкім.

*«Пры дапамозе кампартыі і выдаўца Труцько ў 1936 г. выйшаў мой першы зборнік вершаў «На этапах». На другі дзень цэнзура канфіскавала гэты зборнік, толькі 200 экз. нам удалося тады ўратаваць. Два экзэмпляры я схапіў з друкарні і хутчэй занёс на пошту і выслаў на адрас акадэміі, у Мінск, Купалу і Коласу...»*

## «А, ДЫК ГЭТА ТЫ, ВЫЗВАЛЕНЫ БРАТ...»

Зразумела, для Максіма Танка 17 верасня 1939 года стала доўгачаканым святам. Сімвалічна, што ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР адбылося ў дзень нараджэння паэта. Танк знаходзіўся ў роднай Пількаўшчыне: *«пачаў пісаць верш — першы верш на вызваленай зямлі, чарнавік якога мне ўжо не трэба недзе хаваць. Пачатак гэтага верша не прыйшлося доўга шукаць, бо ён быў на вуснах народа: «Здарова, таварышы!..»*

Ці марыў Максім Танк, што некалі не проста пазнаёміцца з Янкам Купалам і Якубам Коласам, а стане сваім у іх таварыстве?

Танк успамінаў, як падчас Вялікай Айчыннай вайны апынуўся ў эвакуацыі ў Маскве:

*«Часам заседзімся позна, пачынаюся каменданцкі час, і Купала заставаўся начаваць у нас. Я жыў тады з Броўкам. Мы ссоўвалі ложкі і клаліся ўтрох.*

*...Любіў Купала выпіць нямнога. Часам, выпіўшы, ляжа. Не спіцца яму: «Ну, а гэта хто тут ляжыць? Ці не Ная?..» Якая там яму Ная? Гэта, кажу, дзядзька Янка, я. «А, дык гэта ты, вызвалены брат...»*

Раннія публікацыі Максіма Танка напаткаў цяжкі лёс... Быў канфіскаваны польскімі ўладамі і другі яго зборнік «Журавінавы цвет», а таксама паэма «Нарач», выдадзеная асобнай кнігай. Паэму Танк напісаў, узяўшы сюжэтам забастоўку рыбакоў 1935 года. Тады ўрад Польшчы прыняў закон аб нацыяналізацыі рэк і азёр. Нарач перайшла да Дырэкцыі дзяржаўных лясоў, а тая здала возера ў арэнду памешчыку Яблонскаму, які забараніў рыбакам лавіць у «сваім» возеры рыбу — толькі за грошы. У забастоўцы прынялі ўдзел больш за 5 тыс. чалавек. Паэма распаўсюджвалася нелегальна... Калі пасля ўз'яднання Танка запрасілі на літаратурную вечарыну «з удзелам беларускіх савецкіх паэтаў-ардэнаносцаў Петруся Броўкі і Пятра Глебкі», ён чытаў фрагменты з «Нарачы»... У тыя кароткія даваенныя гады Танк напісаў па паэме «Нарач» сцэнарый мастацкага фільма «Бура над Нараччу». Але за часы вайны сцэнарый знік і быў знойдзены толькі ў наш час супрацоўнікамі Нацыянальнага архіва Беларусі. Зборнік «На этапах» быў перавыдадзены да юбілею класіка факсімільным выданнем у 1983 годзе.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

У свеце кніг

# СІМВАЛІЧНЫЯ ПЯЦЁРКІ, або Як пагартаць гісторыю?



Евангелле, надрукаванае Пятром Мсціслаўцам.

**Хочаце ўбачыць арабскі рукапіс XIV стагоддзя? Гэта самы стары (1377 год) рарытэт у фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, які некалі захоўваўся ў гомельскай калекцыі графа Паскевіча. А можа, вам карціць даведацца пра самую старую кнігу беларускага паходжання?**

Гэта богаслужэбны рукапіс праваслаўнай царквы — Мінея службовая на снежань. Пэўны час лічылі, што яна адносіцца да XVII стагоддзя. Але пасля даследчыкі высветлілі, што тады кніга рэстаўравалася: займела новы пераплёт, таксама было ўзноўлена некалькі старонак. Прычым старажытны рэстаўратар імкнуўся стылізаваць пісьмо аднoўленага фрагмента пад почырк арыгінала. Рукапіс аказаўся на два стагоддзі старэйшы.

А мо вас зацікавяць рэдкія старадрукі часоў Гутэнберга ці аўтограф Максіма Багдановіча на адзіным яго прыжыццёвым зборніку «Вянок»? Максім перадаў кнігу свайму сябру Мікалаю Какуеву, у сястру якога Ганну быў закаханы. У 1971 годзе сын Ганны Мікалай Лілееў асобнік з каштоўным аўтографам перадаў бібліёграфу Нацыянальнай бібліятэкі, даследчыцы спадчыны Багдановіча Ніне Ватацы...



Адкрыццё выстаўкі.

Усе гэтыя скарбы можна пабачыць на выстаўцы «5+5+5», якая днямі адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы. Мэта выстаўкі — паказаць самыя каштоўныя, але пры гэтым амаль невядомыя экспанаты з фондаў Нацыяналкі. Некаторыя з іх выстаўляліся толькі аднойчы і, зноў экспанавацца будуць, відаць не хутка, усё ж рукапісы і старадрукі патрабуюць асаблівага абыходжання, і важна захаваць іх для нашчадкаў.

Першая пісьмовая згадка пра Музей кнігі была зроблена ў 1929 годзе на планах архітэктара Лаўрова, які праектаваў будынак на Чырвонаармейскай, дзе бібліятэка працавала да 2006 года. У плане на трэцім паверсе як музей былі пазначаны два памяшканні. Гэтая мара спраўдзілася, толькі калі Нацыянальная бібліятэка перабралася ў вялікі сучасны будынак. Наталля Марцінкевіч, якая ў 2005—2007 годзе ўзначальвала аддзел музейна-экскурсійнай дзейнасці, згадала, як здабывалі адмысловыя вітрыны для будучага музея, бо старадрукі патрабуюць спецыяльных умоў. Музейшчыкі адстойвалі перад Міністэрствам культуры думку, што на такім абсталяванні нельга эканоміць. Калі ж дарагія вітрыны прыбылі з-за мяжы, іх трэба было падняць на трэці паверх пры дапамозе кранаў. Нахваляваліся тады супрацоўнікі бібліятэкі, бо ў той дзень быў моцны, штармавы вецер.

— Тут упершыню з'явілася магчымасць паказаць нам самім, беларусам, наколькі багатую кніжную спадчыну мы маем, — заўважыў падчас адкрыцця выстаўкі **намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Аляксандр СУША**. — Калі пра іншую спадчыну — мастацкую, архітэктурную, літаратурную — было багата манаграфій, каталогаў, паказальнікаў, пра кнігі ведалі найменш. На той час беларусы былі ўпэўнены, што ў нас нічога не засталося. Кнігі Скарыны ездзілі глядзець у Лондан, Пятра Мсціслаўца шукалі дзе заўгодна, толькі не тут.

Музей кнігі ўзяў на сябе пачэсную місію — паказаць, наколькі багатую кніжную спадчыну мы маем. На працягу 15 гадоў у яго сценах адбыліся цудоўныя выстаўкі, якія не проста адкрывалі багаты кніжны свет, але і выхоўвалі інтэлектуалаў, абуджалі гонар за сваю краіну. Можна згадаць цудоўнае святкаванне 500-годдзя кнігадрукавання, якое рабілася супрацоўнікамі Музея кнігі, аддзелам выставачнай дзейнасці ды іншых структурных падраздзяленняў. Помнікі прыбывалі з розных куткоў свету. Адны толькі выданні Скарыны (больш чым пяцьдзясят кніг было прадстаўлена) упершыню вярталіся з шасці краін. Дзякуючы Музею кнігі сюды падцягнуліся і маштабныя сусветныя праекты. Калі запрацавала выстаўка «Беларусь і Біблія», за адзін месяц у Музей кнігі прыйшло каля 30 тысяч наведвальнікаў, і гэта на невялікай выставачнай пляцоўцы! Былі і іншыя вельмі яскравыя праекты з інтэрактывам, супрацай з дзеткамі. На працягу апошніх гадоў развіваецца музейная педагогіка. Многія праекты аказаліся сапраўды наватарскімі. Паступова ўстанова абзавялася сябрамі, якія пачалі перадаваць экспанаты, у тым ліку прадметы накшталт старых пёраў і чарніліц.

Нават у часы ковіду кожная выстаўка ў Музеі кнігі збірае шмат наведвальнікаў. Гэта сапраўды феномен беларускай культуры, прытым музей фактычна не мае сваёй калекцыі — ён найперш паказвае фонды Нацыянальнай бібліятэкі. Хоць можна сказаць, што і ўся бібліятэка працуе на гэта сваё структурнае падраздзяленне, супрацоўнікі музея карыстаюцца навуковымі здабыткамі калег.

## ЧАРОЎНЫ БІЛЕЦІК

**Загадчык Музея беларускага кнігадрукавання — філіяла Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Славіна ГАЎРЫЛАВА** заўважыла, што раней музеі былі пераважна прыватнымі, закрытымі, імі валодалі заможныя людзі. А сёння мы атрымалі білецік як самыя шаноўныя князі, бароны, самыя вартыя людзі, якіх гаспадары запрасілі дакрануцца да сваіх скарбаў. Сапраўды, дзякуючы Музею кнігі любы наведвальнік, у тым ліку самы юны, можа сустрэцца са старажытнымі кніжнымі багаццямі нашай краіны.

Выстаўка «5+5+5», то-бок пятнаццаць, сімвалічна абвяшчае юбілейную дату Музея кнігі, які пачаў працаваць пры бібліятэцы з 2006 года. За кожнай пяцёркай — пяць сюрпрызаў. За першай — унікальныя рукапісы. Акрамя вышэйзгаданых самых старажытных артэфактаў, што маюцца ў фондзе бібліятэкі, тут можна пабачыць адзін з самых цікавых помнікаў — «Тайна тайных», або «Арыстоцелевы вароты» XV стагоддзя. Ён складаецца з твора перакладной беларускай літаратуры, а таксама з артыкулаў, якія прысвечаны варажбе, прадказанням, утрымлівае астралагічныя даныя і табліцы. Тэкст упрыгожаны выявамі сімвалаў задыяка і планет. На палях шмат пазнак, зробленых рознымі почыркамі ў XVI—XVIII стагоддзях, што сведчыць: зборнікам часта карысталіся. І сам рукапіс, і запісы яго чытачоў падказваюць: кніга была створана і захоўвалася на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага.

На выстаўцы таксама экспануецца Скрутак паморскі стараверскі XIX стагоддзя даўжынёй 11 м 70 см — і гэта адзіны прыклад пісьмовага помніка старавераў, які, паводле сведчанняў, выкарыстоўваўся ў асяродку вернікаў Сібіры, Браншчыны і Гомельшчыны.

Арганізатары вырашылі паказаць у тым ліку і кнігі, звязаныя з сусветнымі кніжнымі традыцыямі: кніга-потхі на пальмавых лістах XIX стагоддзя прыбыла з Індыі. Пласцінкі, надпісы на якіх рабіліся завостраным інструментам, звязаны паміж сабой скураным матузком і змяшчаюць сакрэты народнай індыйскай медыцыны (Аюрведа).

У Нацыянальнай бібліятэцы захоўваецца 10 кніг Францыска Скарыны, выдадзеных у Празе ў 1517—1518 гадах. Яны былі набыты ў 1925 годзе ў Ленінградзе ў мясцовага бібліяфіла Камарніцкага. Адна з іх — Біблія. Чатыры з гэтых кніг выстаўляюцца на юбілейнай экспазіцыі.

Тут жа і Евангелле, надрукаванае Пятром Мсціслаўцам у Вільні ў 1575 годзе. Гэта першае і адно з найбольш дасканалых выданняў друкарні Мамонічаў. Друкарская праца Пятра Мсціслаўца, які працаваў тут у1574—1576 гадах, у далейшым паўплывала на развіццё кніжнай гравюры. Так, у Евангеллі гравюры з выявамі евангелістаў выкананы ў асаблівым стылі фігурных выяў.

Сёння толькі дасведчаныя асобы могуць ведаць пра старадрук Аляксандра Гваньіні «Хроніка еўрапейскай Сарматыі». Хоць гравюры (выявы гербаў, князёў, батальных сцэн), напэўна, вядомы любому школьніку — іх запазычваюць у сучасныя падручнікі менавіта з гэтай кнігі. «Хроніка еўрапейскай Сарматыі» — адна з першых друкаваных гісторый беларускіх зямель. Яна выйшла пад аўтарствам гісторыка і вайскоўца, які быў камендантам Віцебска і займаўся ўмацаваннем абарончых пабудоў.

Вартае ўвагі і першае прыжыццёвае выданне знакамітага трактата нашага суайчынніка і тэарэтыка артылерыі, аднаго з заснавальнікаў сусветнай ракетнай балістыкі і касманаўтыкі Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі». Між іншым, кніга, прадстаўленая на выстаўцы, надрукавана ў Амстэрдаме ў 1650 годзе! Даследаванне, якое ўключае гравюры з малюнкамі, створанымі па эскізах аўтара, было перакладзена на многія еўрапейскія мовы.

Таксама ў пяцёрку старадрукаў увайшоў «Гербарый», надрукаваны ў Майнцы ў 1484-м Петэрам Шоферам, які пачынаў працаваць з еўрапейскім першадрукаром Іаганам Гутэнбергам. «Гербарый» паходзіць з Нясвіжскага кнігазбору Радзівілаў.

У топ-5 рэдкіх трапілі кнігі з аўтографамі Максіма Багдановіча і Марка Шагала. Апошні пакінуў дароўны надпіс на кнізе, якая выйшла ў Парыжы ў серыі «Новыя французскія мастакі», і гэта было першае даследаванне творчасці майстра.




Зборнік «Вянок» з аўтографам Максіма Багдановіча.

У чароўнай пяцёрцы і арт-кніга ў выглядзе альбома Поля Валеры «Прыпавесці да 12 акварэляў Лу Альбер-Лазар», выдадзеная ў Парыжы ў 1935 годзе тыражом усяго ў 300 экзэмпляраў. Поль Валеры — французскі паэт, эсэіст, філосаф, які неаднаразова намінаваўся на Нобелеўскую прэмію па літаратуры і шмат сваіх прац прысвячаў мастацтву, гісторыі, музыцы і літаратуры. Дарэчы, сёлета святкуецца 150-годдзе з дня яго нараджэння.

Выстаўляюцца і мініяцюрныя кнігі: выданне нямецкага календара 1854 года памерам 85 на 50 мм. Штогод такія кішэнныя календары мелі пэўнае афармленне. У дадзеным экзэмпляры змешчаны каляровыя гравюры да літаратурных твораў, вельмі папулярных у той час. Адны з іх прысвечаны вершу Фрыдрыха Шылера «Песня звона», іншыя з'яўляюцца ілюстрацыямі да рамана амерыканскай пісьменніцы Гарыет Бічэр-Стоў «Хаціна дзядзькі Тома».

Яшчэ адна кніжка-малеча на выстаўцы памеру 100 на 65 мм. Гэта зборнік вершаў Сяргея Законнікава, Анатоля Зэкава і Алеся Пісьмянкова з дароўнымі надпісамі аўтараў. Дадзеная кніга існуе ў адзіным экзэмпляры. Яна зроблена ў 1999 годзе і перададзена ў фонд Нацыянальнай бібліятэкі.

## ПРАМОЎТАРЫ КНІГІ

У свой юбілей Музей кнігі сабраў навукоўцаў, калег і сяброў за круглым сталом. Акрамя супрацоўнікаў сталічных музеяў, з якімі Нацыянальная бібліятэка ладзіць сумесныя праекты, прыехалі госці з раённых і абласных цэнтраў, каб разам абмеркаваць будучыню музеяў, абмяняцца вопытам.

**Прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ** заўважыў, што сёння ўсё часцей пачынае выкарыстоўвацца тэрмін «музейная індустрыя», і калі раней бізнес і музей падаваліся несумяшчальнымі, то цяпер выкладаецца курс «Музейны менеджмент».

Музеі робяць вялікі ўнёсак у адукацыйную сферу. Так, Музей кнігі абуджае цікавасць да кніжнай спадчыны і чытання ўвогуле, шмат увагі надае дзіцячым праектам і выхоўвае будучых чытачоў. Ужо назапашаны вопыт музейна-педагагічных праектаў, і сёння яго трэба вывучаць і пашыраць, выкладаць курс музейнай педагогікі ў ВНУ.

**Таццяна РОШЧЫНА**, якая доўгі перыяд узначальвала аддзел рукапісаў рэдкіх кніг і старадрукаў Нацыянальнай бібліятэкі, падзялілася перадгісторыяй стварэння музея пры бібліятэцы. Думкі аб неабходнасці такой установы яшчэ ў 1980-я гады на старонках прэсы выказваў тагачасны загадчык аддзела рэдкай кнігі Ігар Жолудзеў. Створаныя па яго ініцыятыве выстаўкі «Мікола Гусоўскі і яго час» і «Гартаючы вечныя старонкі» фактычна былі першымі спробамі музейных праектаў, але ў старым будынку катастрафічна не хапала месца. Разглядаліся планы аб стварэнні музея на базе Пушкінскай бібліятэкі на вуліцы Інтэрнацыянальнай, але ў складаныя 90-я здзейсніць задуму не ўдалося. Супрацоўнікам бібліятэкі таксама давялося адстойваць сваю ідэю перад Мінкультуры, якое прапаноўвала стварыць музей беларускай літаратуры. Музей кнігі павінен быў працаваць зусім у іншым кірунку.

Як заўважыла **загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Вольга ГУЛЕВА**, яе ўстанова ўдзяляе вялікую ўвагу не проста асобным кнігам як выніку працы аўтараў, але і цэлым пісьменніцкім архівам. Сёння кніга аб'ядноўвае многія ўстановы, з'яўляецца найважнейшым сродкам масавай інфармацыі, адукацыі і вельмі важным элементам культуры. А ў супрацы папулярызаваць кніжную культуру значна прасцей і цікавей.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

